НАЙЛЕПШЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 КРАСАВІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 71 (30205)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

СЦЕРАЖЫЦЕСЯ, ЗБІРАЮЧЫСЯ Ў ЛЕС

13

КАРАТКА

• **На вугальны разрэз «Распадскі» (Расія) адгружана 23 новыя самазвалы БелАЗ.**

• Дзецям пры неўралагічных парушэннях, сутаргавым сіндроме, эпілепсіі ў анамнезе не рэкамендуецца катацца на атракцыёнах.

• **Атракцыёны ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага, парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў і парку імя 900-годдзя Мінска запрацуюць 26 красавіка.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ГІГІН, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:

«У нас здаровая грамадзянская супольнасць. Мы гэтае паняцце ачысцілі ад такіх напластаванняў, не ўласцівых яму, якія часта з Захаду прыходзілі, дзе грамадзянскую супольнасць разглядаюць як інструмент маніпулявання палітычнай сістэмай. Мы ж, прыняўшы закон, увялі грамадзянскую супольнасць у прававое поле. І аказалася, што ў нас магутныя арганізацыі, у нас даволі шмат грамадзянскіх ініцыятыў патрыятычнай, сацыяльнай скіраванасці. Людзі гатовы самааб'ядноўвацца, і дзяржава гэта падтрымлівае. Адно толькі патрабаванне — дзейнічаць у рамках закона. І ў развіццё гэтага, вядома ж, ніякага замежнага ўплыву быць не можа. Калі мы выконваем гэтыя правілы, калі мы дзейнічаем у інтарэсах людзей, то ёсць вынік».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ПРАЕКТЫ ПА ДАСЯГНЕННІ ТЭХНАЛАГІЧНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ ПАВІННЫ СТАЦЬ МАТОРАМ АБНАЎЛЕННЯ НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ»

Як павінна развівацца беларуская прамысловасць на ўзроўні тактыкі і стратэгіі

Канструктыўная, грунтоўная і прынцыповая размова на найважнейшую тэму прайшла ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную стану і задачам прамысловасці краіны. Гэту нараду кіраўнік дзяржавы анансаваў яшчэ ў студзені падчас наведвання завода «БЕЛДЖЫ». Тады ён падкрэсліваў неабходнасць разгледзець вынікі работы арганізацый прамысловасці. За амаль тры месяцы Прэзідэнт неаднойчы пераносіў гэту нараду, каб узбуйніць састаў і разгледзець усе праблемы і перспектывы айчыннай прамысловасці. У выніку ў Палацы Незалежнасці сабралася больш чым 250 чалавек, сярод якіх вышэйшыя службовыя асобы, члены ўрада, губернатары, кіраўнікі прадпрыемстваў, навукоўцы і іншыя адказныя асобы. У такім складзе абмеркаванне атрымалася надзвычай плённым і працягвалася амаль чатыры гадзіны.

Фота БелТА.

На пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што па выніках мінулага года ўжо праведзены шэраг вялікіх нарад. І яны яшчэ будуць праводзіцца ў іншых сферах. Прэзідэнт адзначыў, што на нарадзе па прамысловасці неабходна абмеркаваць перспектывы айчыннай прамысловасці і пытанні якасці прадукцыі. Ужо зроблены пэўныя крокі. На некаторыя ключавыя пазіцыі прыйшлі ўжо новыя людзі, і прыняты шэраг рашэнняў. «Цяпер трэба абмеркаваць, як будзем рухацца далей. І на ўзроўні стратэгіі, і на ўзроўні тактыкі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён акрэсліў блокі пытанняў, на якія варта звярнуць асаблівую ўвагу.

Першае. Вытворчасць

«Урад дакладвае, што ў цэлым Мінпрамам апошнія некалькі гадоў забяспечваецца стабільны рост аб'ёмаў вытворчасці. За тры гады прыраслі амаль на 40 працэнтаў. Ёсць вынік і ў мінулым годзе. Прамысловай прадукцыі выраблена амаль на 30 мільярдаў рублёў, тэмп росту — амаль 113 працэнтаў. Назіраецца значнае павелічэнне выпуску электронікі, легкавых і грузавых аўтамабіляў, камбайнаў. «Планар», «ІНТЭГРАЛ» і «БелОМА» поўнасцю сфарміравалі партфель экспартных заказаў на бягучы год і часткова на 2025-ы, — пералічыў Прэзідэнт. — Але што з іншымі прамысловымі гігантамі? Чаму скараціліся аб'ёмы выпуску халадзільнікаў, трактароў, пагрузчыкаў, рухавікоў?»

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што больш чым на чвэрць прасеў «Бабруйскагрcamаш». Толькі на 12 працэнтаў у 2023 годзе быў загружаны Мінскі падшыпнікавы завод. Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі маецца шматгадовы досвед працы ў станкабудаванні — найважнейшай галіне ў любой індустрыяльнай эканоміцы.

«А якая сітуацыя тут сёння? Дзе выкарыстанне сучасных тэхналогій, такіх як штучны інтэлект, рабатызацыя? А менавіта яны забяспечваюць высокую дакладнасць і прадукцыйнасць у апрацоўцы матэрыялаў, эканомію рэсурсаў, зніжэнне затрат і якасць прадукцыі. Усяго гэтага няма. Але што самае сумнае — няма бачання перспектывы. Чакаю ад вас канкрэтных прапаноў, як будзем выпраўляць сітуацыю», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Прыярытэты

СТАЎКА НА КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ

У нашай краіне выяўлена 12 тысяч радовішчаў карысных выкапняў, з іх 1300 падрыхтавана для прамысловай вытворчасці. Геалагаразведачныя работы для пошуку новых радовішчаў вядуцца ў Беларусі ўжо досыць даўно. Гэтая дзейнасць важная для павышэння эканамічнага патэнцыялу краіны, а таксама для папаўнення мінеральна-сыравіннай базы краіны.

Як вядома, асноўныя работы па павышэнні геалагічнай вывучанасці тэрыторыі, нарошчванні мінеральна-сыравіннай базы краіны, удасканаленні тэхналогій здабычы і перапрацоўкі сыравіны вядуцца па Дзяржаўнай праграме «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2021—2025 гады. Пра перспектывы здабычы карысных выкапняў у нашай краіне расказала **кансультант упраўлення па геалогіі Галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Мінпрыроды Марыя ШАСТАК.**

Калійныя солі выйшлі ў «плюс»

У параўнанні з цяжкім 2022 годам летась здабыча калійных солей вырасла ажно на 70 %. Гэтага ўдалося дасягнуць дзякуючы паспяховаму развіццю лагістыкі нашых паставак мінеральных угнаенняў за мяжу. Вырасла здабыча пяску для шкла на 15 %, будаўнічага каменя — на 13 % і абліцовачнага — на 1 %. Гэта дазваляе зніжаць імпарт мінеральнай сыравіны.

СТАР. 4

Соцыум

ПАМЯТАЕМ, ШАНУЕМ, КЛАПОЦІМСЯ

Да Дня Перамогі ветэраны атрымаюць значную матэрыяльную дапамогу

У Беларусі жыве каля 1100 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Іх узрост набліжаецца да 100 гадоў, а некаторыя яго перасягнулі.

СТАР. 5

Фота БелТА.

«...СТАЦЬ МАТОРАМ АБНАЎЛЕННЯ

Другое. Рэалізацыя прадукцыі

«Вырабіць — добра. Гэта мы ўмеем. Якасна, няякасна, дорага, танна — вырабілі. Але галоўнае пытанне — рэалізаваць прадукцыю і атрымаць грошы. У апошнія гады знешні гандаль арганізацый Мінпрама характарызаваўся, з аднаго боку, ростам экспартных паставак, з другога — вымушаным сыходам з заходніх рынкаў», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. У 2023 годзе галіна выдала рэкордны за апошняе дзесяцігоддзе экспарт — 6,5 мільярда долараў. Прырост да ўзроўню 2022 года — амаль паўмільярда (8 працэнтаў). «Прычым экспарт стабільна павялічваецца тры гады запар. Значыць, прамысловасць змагла ніверавацца негатыўныя тэндэнцыі 2019—2020 гадоў. Дарэчы, трэба нам разгледзець структуру гэтага так званага экспарту. Пастаўкі пераарыентаваны на рынкі дружалюбных краін. У першую чаргу на традыцыйны рынак нашай Расіі і іншых дзяржаў СНД», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Але, па яго словах, на далёкім замежжы сітуацыя нашмат горшая. Аб'ём продажаў склаў менш чым 20 працэнтаў у адносінах да дасанкцыйнага 2021 года. Не выкананы планы па экспарце ў дружалюбныя краіны Далёкай дугі. «У Афрыцы, Лацінскай Амерыцы, Азіі сёння вялізны попыт на прамысловую прадукцыю. Тут трэба шчыльна працаваць і займаць свае нішы. І перш за ўсё — на Афрыканскім кантыненце. Харчовая бяспека — адно з самых жыццёва важных для Афрыкі пытанняў. Таму там асабліва запатрабаваны сельскагаспадарчая тэхніка і абсталяванне. Я ведаю гэтыя цяжкасці, складанасці. Але пры складанасцях там трэба працаваць. І той, хто хоча працаваць, той там працуе», — заўважыў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што сёння ёсць дамоўленасці аб пастаўках звыш трох тысяч трактароў, 80 камбайнаў і 30 самазвалаў у Зімбабвэ. Больш за 150 трактароў — у Тагалезскую Рэспубліку. У 2024 годзе плануюцца пастаўкі тэхнікі ў Нікарагуа, В'етнам, Іран, Пакістан.

«А чаму пасля ўсіх праведзеных перагавораў на вышэйшым узроўні мы не працуем з Экватарыяльнай Гвінеяй? — спытаў Прэзідэнт. — Відавочна, трэба ісці далей, пашыраць супрацоўніцтва. І разумець, што наша стратэгічная задача — стварэнне зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі ў апорных краінах. Ключавая мэта сёння — дыверсіфікацыя экспарту. Усё, што патрабуецца ад мяне для гэтага, рымаецца неадкладна. Створаны неабходныя ўмовы, і вам трэба як мага больш актыўна выкарыстоўваць меры фінансавай падтрымкі беларускага экспарту».

Па словах Прэзідэнта, нягледзячы на тое што больш за 90 працэнтаў прадукцыі ідзе на рынак Расіі, мы стрэчаем там пазіцыі па традыцыйных беларускіх таварах, якія заўсёды карысталіся попытам за свае якасць і надзейнасць. «Мне дакладваюць, што сёння айчынная прадукцыя саступае аналагам як па кошце, так і па якасці. Па кошце яшчэ вытлумачальна. Але чаму па якасці?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Экспарт беларускіх трактароў у 2023 годзе скараціўся на 18 працэнтаў. Доля беларускіх трактароў у расійскім імпарце знізілася да мінімальных за апошняе дзесяцігоддзе 10,6 працэнта, грузавых аўтамабіляў — да 6 працэнтаў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін вядомы брэнд «Атлант», у рабоце якога назіраюцца тыя ж пагрозлівыя тэндэнцыі. Аб'ёмы экспарту халадзільнікаў і маразільнікаў, яшчэ ўчора запатрабаваных, скараціліся амаль у два разы. «Што перашкаджае прадаваць прадукцыю? Кітай, Індыя і іншае... Дык вы прывыкайце да канкурэнцыі. Канкурэнцыя будзе толькі ўзмацняцца. Дайшлі да таго, што сістэматычна ўзнікаюць прастоі, а людзей адпраўляюць у вымушаныя водпускі, — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. — Чаму мы губляем рынак? Усе чулі, у што-гадовым Пасланні Прэзідэнт Расіі анансаваў, што да 2030 года суб'екты Федэрацыі павінны атрымаць каля 40 тысяч аўтобусаў, тралейбусаў, трамваяў, электробусаў. Грошы на гэта прадугледжаны. Задача беларускай прамысловасці — падключыцца і забяспечыць не менш як 30 працэнтаў патрэбных аб'ёмаў. Гэта наша ніша. Трэба толькі закасаць рукавы і працаваць. Тыя часы, калі за плыт выкінуў трактар і аўтамабіль, і прыйшлі людзі, якія ў чарзе стаялі і купілі ваш трактар, даўным-даўно скончыліся». Прэзідэнт падкрэсліў, што Міністэрства замежных спраў павінна тут быць у першых радах. Па яго словах, у рэалізацыі прадукцыі на экспарт роля знешнепалітычнага ведамства вызначальная.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адну негатыўную тэндэнцыю — унутраны рынак аддаём канкурэнтам. «Нягледзячы на наяўнасць шырокай лінейкі айчыннай тэхнікі, да гэтага часу закупляем імпартныя аналагі. І гэта не адзінкавыя выпадкі. Летась толькі трактароў набылі больш за 1000. Амаль на 40 мільёнаў долараў. Праводзім мадэрнізацыю падшыпнікавага завода. Якасць прадукцыі сёння супастаўная з прадукцыяй сусветных лідараў. Аднак высокія выдаткі на вытворчасць не дазваляюць канкурыраваць па кошце ў тэндарных закупках нават на канвееры беларускіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў. Толькі ці справа ў тэндарах? — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Забываем простую ісціну: скупы плаціць двойчы. Можна сэканоміць капейкі на кошце падшыпніка і страціць тысячы ад прастою тэхнікі з-за яго замены». Прэзідэнт спытаў пра меры, якія прымаюцца па абароне ўнутранага рынку. Што канкрэтна зроблена і робіцца?

«Пакуль, як следства ўсіх пазначаных негатыўных тэндэнцый, — праблемы з рэалізацыяй. Склады трашчаць ад гатовай прадукцыі. Складскія запасы за 2023 год выраслі амаль на чвэрць (на 350 мільёна рублёў, ці на 23 працэнты). Віцэ-прэм'ер профільны мяне супакойвае: «Гэта нармальна, так заўсёды было, і ўчора, і пазаўчора. Мы тут зараз усё прададзім». Але мы ж перыяд да перыяду ацэньваем гэтыя запасы. А колькі тэхнікі знаходзіцца на пляцоўках у дылераў, якія шмат для каго сталі дадатковым складам за мяжой? За гэтую шырму ў чарговы раз ні ў кога схавацца не атрымаецца», — акрэсліў праблему Аляксандр Лукашэнка.

І зноў гаворка зайшла пра Мінскі трактарны завод. Як заўважыў Прэзідэнт, на складах яго гандлёвых дамоў амаль 6,5 тысячы адзінак тэхнікі, гэта больш за двухмесячны аб'ём вытворчасці. «Вось дзе вашы аб'ёмы і экспарт. Пры гэтым, як дакладвае Камітэт дзяржаўнага кантролю, значная колькасць суб'ектаў тавараправодных сетак увогуле не бярэ ўдзелу ў рэалізацыі прадукцыі (навошта вы іх стваралі тады?), а яе кошт пры продажах праз гандлёва-правадзячыя сеткі значна ўзрастае. Каго кормім там?» — спытаў беларускі лідар. Ён прывёў яшчэ адзін прыклад. Пры рэалізацыі ў Расійскую Федэрацыю па схеме «вытворца — генеральны імпарцёр — дыстрыб'ютар — дылер — канчатковы спажывец» кошт франтальных пагрузчыкаў «АМКАДОР» павялічваецца ў цане больш як на 50 працэнтаў, грузавой і пасажырскай тэхнікі МАЗ — на 20 працэнтаў. «Ну і як тут канкурыраваць?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. Ён таксама звярнуў увагу, што не забяспечана выкананне патрабавання па скарачэнні знешняй пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці. За мінулы год яна выраслa больш чым на 10 працэнтаў. «Узнікае простае пытанне: навошта мы крэдытуем пакупніка? З'яўленне запазычанасці часта з'яўляецца вынікам бяздумнай гонкі за выкананнем паказчыкаў па разгрузцы складоў і экспарту», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падвёў агульны вынік. Гэта — найперш падзенне якасных паказчыкаў развіцця прадпрыемстваў. Рэнтабельнасць не дацягвае да ўзроўню 2022 года. Растуць колькасць стратных арганізацый і сумы іх страт.

«Так, мы маем складаную лагістыку і рост кошту імпартнай сыравіны. Разбурэнне кааперацыйных сувязяў з заходнімі пастаўшчыкамі прывяло да неабходнасці пошуку альтэрнатыўных партнёраў або наладжвання ўласнай вытворчасці камплектавальных. У тым ліку паскоранай распрацоўкі і ўкаранення новых тэхнічных рашэнняў. Што рабіць, увогуле зразумела. Чаму тармозім? Чаму не робім?» — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Трэцяе. Імпартазамяшчэнне

«Мы можам ствараць канкурэнтаздольную тэхніку з выкарыстаннем айчынных матэрыялаў і камплектавальных. Тут даказваць нічога не трэба. Мы можам, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Аднак па шэрагу кірункаў абнаўленне прадукцыі і вытворчасцяў ідзе вельмі марудна. Кожная крытычная пазіцыя паказвае нашы слабыя месцы. Менавіта па іх канкурэнты потым б'юць санкцыямі». Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна прыняць меры па забеспячэнні максімальнай тэхналагічнай незалежнасці і стварэнні ўмоў для ўстойлівай работы эканомікі, якая не залежыць ні ад якіх санкцый. Аляксандр Лукашэнка назваў гэта стратэгічнай задачай для нашага прамыслovага комплексу.

«Шлях адвёрткавай зборкі магчымы толькі ў пачатку новай вытворчасці. Трэба выбудаваць надзейную абарону ад любых вонкавых фактараў. Гэта яшчэ адна задача для ўсіх. Вось чаму так жыццёва важна імпартазамяшчэнне, якім трэба займацца ўвесь час. Сёння гэта прырытэт прыярытэтаў. Мы шмат пра гэта гаворым, але разгортваемся вельмі павольна. Доля імпартнага складніка ў беларускай прадукцыі па-ранейшаму высокая», — заўважыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што для інвестараў ставяцца ўмовы па дасягненні вызначанага ўзроўню лакалізацыі. Яны іх прымаюць і выконваюць. А па беларускіх традыцыйных вытворчасцях доля імпартнага складніка ў сыравіне і матэрыялах застаецца на высокім узроўні, паказчыкі з году ў год практычна не зніжаюцца.

«Да вас патрабаванне па ўсіх кірунках распрацаваць стратэгіі па павышэнні ўзроўню лакалізацыі. Давяздзіце да кожнага напружаныя заданні і забяспечце іх рэалізацыю, — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. — Упэўнены, усе прысутныя таксама добра разумеюць, якія рызыкі нясе залежнасць ад замежнага абсталявання і праграмнага забеспячэння. Таму стварэнне айчыннага софту і яго ўкараненне павінны стаць безумоўнай першачарговай задачай для нашых распрацоўшчыкаў. Пакуль па гэтым кірунку ўвогуле нічога не робіцца. Як карысталіся заходнім праграмным забеспячэннем, так і працягваем».

Па словах беларускага лідара, асноўная маса сённяшніх праектаў — гэта мадэрнізацыя прамысловых гігантаў, якія мы захавалі з часоў Савецкага Саюза (МАЗ, Трактарны завод, БЕЛАЗ). «Гэта добра, але нам неабходна стварыць абсалютна новыя, перадавыя вытворчасці, якія выпускаюць інавацыйныя прадукты. І таму яшчэ адной задачай для вырашэння існых праблем бачыцца ўзмацненне інтэграцыі прамысловасці з навукай. Развіццё высокатэхналагічных галін, вытворчасць вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратуры. Ужо цяпер мы павінны рыхтаваць навукова-даследчую базу і інжынерна-тэхнічны персанал для распрацоўкі перспектыўных тэхналогій і фарміравання навукова-тэхнічнага зачыну ў мэтах далейшага развіцця мікраэлектроннай прамысловасці», — заявіў ён.

Па словах Прэзідэнта, у гэтых умовах асаблівую важнасць набывае рэалізацыя праграм Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, сумесных імпартазамяшчальных праектаў, якія ствараюць аснову тэхналагічнага суверэнітэту і эканамічнай бяспекі. «Сродкі выдзелены. Іх неабходна не толькі своечасова асвоіць, але і стварыць прадукт, які будзе карыстацца доўгатэрміновым попытам», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аднак, па яго словах, да якаснай мадэрнізацыі галіны пры-фільнае міністэрства і прадпрыемствы не былі гатовы. Да нядаўняга часу не было ні праектаў, ні ідэй. «Я сумняваюся, што яны ёсць і цяпер. Работа пайшла, хоць тэмпы відавочна патрабуюць паскарэння», — заўважыў беларускі лідар. Камітэтам дзяржаўнага кантролю ўстаноўлены шэраг праблемных пытанняў. Не забяспечаны эфектыўнасць і выхад на праектныя магутнасці асобных мадэрнізаваных вытворчасцяў, у выніку чаго выклікае сумненне іх акупнасць ва ўстаноўленыя тэрміны, заўважыў Прэзідэнт. Загрузка высокатэхналагічнага абсталявання, уведзенага ў 2023 годзе Аршанскім інструментальным заводам, па вытворчасці імпартазамяшчальнага сучаснага металарэзнага інструмента (свёрлаў і фрэз) складае толькі 50 працэнтаў.

«Зноў тармажэнне. Няўжо незразумела: будзем тармазіць і плесціся ў хвасце — нас затопчуць. Вам далі ўсе неабходныя інструменты па фінансаванні праектаў, далі паўнамоцтвы для прыняцця аператыўных рашэнняў. Што яшчэ патрэбна? — спытаў Прэзідэнт. — Наша стратэгічная задача — дасягнуць тэхналагічнага суверэнітэту ў скразных сферах, якія забяспечваюць устойлівасць усёй эканомікі краіны. Гэта сродкі вытворчасці, станкі, робататэхніка. Праекты па дасягненні тэхналагічнага суверэнітэту павінны стаць маторам абнаўлення нашай прамысловасці, дапамагчы ўсёй эканоміцы выйсці на перадавы ўзровень эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці». Таму, па словах кіраўніка дзяржавы, задача ўрада — ужо цяпер прапрацаваць і сфарміраваць доўгатэрміновы, як мінімум да канца бягучага дзесяцігоддзя, заказ ад расійскіх партнёраў на высокатэхналагічную прадукцыю, каб нашы прадпрыемствы разумелі, па якіх правілах ім працаваць у Расіі.

Чацвёртае. Дысцыпліна

«Мы зноў вяртаемся да пытанняў выканальніцкай дысцыпліны, дакладней да яе адсутнасці і слабага кантролю на ўсіх узроўнях. Як вынік, увесь час выкрываюцца карупцыйныя схемы, і, што абсалютна непрымальна, колькасць іх расце. Ну, гэта вашы праблемы. Хочаце сядзець у турме і не працаваць — калі ласка», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле інфармацыі Генеральнай пракуратуры, па выніках мінулага года колькасць такіх злачынстваў выросла амаль на чвэрць. Выкрыта карупцыйная схема подкупу службовых асоб прадпрыемстваў прамысловасці за арганізацыю закупак абсталявання ў пэўных камерцыйных арганізацый. Узбуджаны крымінальныя справы ў дачыненні да службовых асоб нашага флагмана — ААТ «БЕЛАЗ». Устаноўлены факт, калі прадугледжаная заканадаўствам магчымасць рэалізацыі прадукцыі па цэнах ніжэйшых за сабекошт (пад маркай разгрузкі складоў) выкарыстоўвалася для асабістага ўзбагачэння службовых асоб. Тавар па нізкіх цэнах адгружаўся падкантрольнаму пасрэдніку, пасля чаго перапрадаваўся па больш высокім кошце. Рэгулярна выяўляюцца факты крадзяжу гатовай прадукцыі і камплектавальных да яе. Камітэт дзяржаўнага кантролю паведамляе, што бардак і ў металургічнай галіне. «Белдругасмет» не забяспечвае металургічныя і машынабудаўнічыя прадпрыемствы ломам чорных і каляровых металаў у неабходных аб'ёмах. «Ваша безгаспадарчасць і дыспарытэт закупачных цэн на металалом стварылі перадумовы для ўзнікнення ценявога абароту на рынку металасыравіны. Я даручыў Генеральнаму пракурору надаць самую пільную ўвагу гэтым пытанням. І не трэба тут спасылацца не нейкія рызыкі. На гэта ўжо вочы закрываем. Але калі вы ўжо ў кішэню кладзеце, і гэта на вачах у тых, хто павінен глядзець і глядзець, вы не хадзіце і не плачце, што тут празмерна некага напружваюць. За памылку ніхто нікога не пакарае. Вы заўсёды можаце дастукацца нават да Прэзідэнта і растлумачыць сваю памылку. Але калі вы крадзеце бессаромна, апускаючы працоўныя калектывы тысячныя і флагманы нашай прамысловасці, — даравання тут не будзе. Я буду Прэзідэнтам ці хтосьці іншы, калі вы хочаце захаваць краіну, будзе тое ж самае, адказнасць будзе самая жорсткая», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Пятае. Якасць прадукцыі

Ключавым пытаннем Аляксандр Лукашэнка назваў забеспячэнне якасці вырабляльнай прадукцыі і належнага сэрвіснага абслугоўвання. «Калі па галоўных пазіцыях прасядаем, то аб якой рэалізацыі можна казаць? Факты, аб якіх дакладвае Камітэт дзяржаўнага кантролю, недапушчальныя. Асабліва выпадкі, калі новая тэхніка выхо-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ»

дзіць са строю яшчэ да пачатку эксплуатацыі. Мы гэта бачым унутры Беларусі», — сказаў ён.

Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што апошнім часам намецілася адмоўная тэндэнцыя па якасці меліярацыйнай тэхнікі. З набытых у 2022 годзе за кошт бюджэтных сродкаў 47 аднакаўшовых экскаватараў вытворчасці ААТ «Амкадор-КЭЗ» 43 (а гэта 91 працэнт) падлягалі рамонту на працягу першых шасці месяцаў эксплуатацыі. «Як вынік, гэтым пачынаюць карыстацца дылеры нашых канкурэнтаў, патэнцыйныя пакупнікі беларускай прадукцыі ідуць да канкурэнтаў. Такое проста недапушчальна», — заўважыў Прэзідэнт. Меліярацыйнымі арганізацыямі ў 2023 годзе закуплена 166 адзінак імпартнай тэхнікі агульным коштам 55 мільёнаў рублёў, у тым ліку 47 аднакаўшовых экскаватараў вытворчасці КНР на суму 18 мільёнаў рублёў. Недахопы выяўлены і ў арганізацыі сэрвіснага абслугоўвання. З-за адсутнасці неабходнай колькасці запасных агрэгатаў і вузлоў, па якіх меліся адмовы, парушаліся тэрміны ўхілення непаладак. Даванне сельгасарганізацыям тэхнікі з падменнага фонду на перыяд рамонтных работ не кампенсуе ў поўнай меры негатыўных наступстваў яе працяглага прастою.

«Працягваюць фіксавацца надзвычайныя здарэнні з эксплуатавальнай у Расіі беларускай тэхнікай, якія потым асвятляюцца СМІ і выклікаюць грамадскі рэзананс», — заўважыў беларускі лідар.

«У Год якасці (ды і заўсёды) прадукцыя, якая вырабляецца, павінна быць на самым высокім узроўні. І ніяк інакш. Гэта не капрыз, а суровая жыццёвая неабходнасць. Пытанне будучыні краіны і народа. Наша прадукцыя павінна быць якаснай па ўсіх характарыстыках і параметрах», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што сёння вельмі складана канкурыраваць па кошце з кітайскімі вытворцамі. «Хоць трэба, нікуды не дзенемся. Значыць, трэба браць выключнай якасцю прадукцыі і забеспячэннем неабходнага для спажыўца сэрвісу. Мы павінны выйсці прыкладна на японскі ўзровень якасці. Задача — замацавацца і павялічыць долю рынку. А калі будзем бяздумна гнацца за мінімальным коштам, страцім не толькі якасць канчатковай прадукцыі, але і вытворчасці ўласнай кампанентнай базы», — сказаў беларускі лідар.

Шостае. Кадры

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сёння ўсё важна: інвестыцыі, тэхналогіі, дысцыпліна, якасць прадукцыі. «Але важней за ўсё — кадры, кадры і яшчэ раз кадры. Яны вырашаюць усе гэтыя праблемы. Высакакласны спецыяліст вырашыць любую праблему, недавучка загубіць справу. Аднак мы сёння вымушаны казаць не аб якасці падрыхтоўкі кадраў, а аб іх павальным дэфіцыце. Асабліва рабочых», — адзначыў ён. На сёння у цэлым па краіне з 27,8 тысячы вакансій у апрацоўчай прамысловасці 85 працэнтаў (23,5 тысячы) прыпадае на рабочыя спецыяльнасці. Найбольш запатрабаваныя слесары, вадзіцелі, станочнікі, зваршчыкі. У ААТ «МАЗ» недакамплект работнікаў складае 13 працэнтаў. У ААТ «Мінскі маторны завод» назіраецца цякучка рабочых спецыяльнасцяў: слесараў, токараў, мантажнікаў, электраманцёраў, шліфоўшчыкаў і фрэзероўшчыкаў.

«Пры гэтым амаль упэўнены, што адміністрацыйна-кіраўнічы персанал у вас адкрыта раздуты. Напрыклад, на МТЗ толькі маркетынгавая служба амаль 100 чалавек. А паўгадавы запас на складах дзяваць няма куды, — заўважыў Прэзідэнт. — Узнікае пытанне: як павысіць матэрыяльную зацікаўленасць рабочых на прадпрыемствах? І як іх кіраўніцтва мае намер вырашаць гэту праблему? Бракуе рабочых? Можа быць, ураду прыйшоў час падумаць аб прыцягненні пенсіянераў? Сярод іх ёсць шмат актыўных людзей, якія жадаюць працаваць. Няхай не рванём на 30 тысяч чалавек, але мы знойдзем некалькі тысяч патрыятычна настроеных людзей, якіх можам паклікаць на вытворчасць, і яны з задавальненнем прыйдуць і будуць працаваць, карысць прыносіць. Трэба вырашыць, як іх зацікавіць матэрыяльна. Гэта вашыя рэзервы».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што за гэтыя гады шмат сказана аб замацаванні на месцах маладых спецыялістаў. «Пераламалі мы негатыўную тэндэнцыю на гэтым фронце? Падобна, не. Больш за тое, эксперты папярэджваюць, што растуць рызыкі страты кампетэнцый у галіне канструявання і распрацоўкі новых відаў прадукцыі. Чаму? Бо на большасці прадпрыемстваў у аддзелах канструктараў і распрацовак мала маладых спецыялістаў», — сказаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта ўжо пытанне не толькі да Мінпрама, але і да Мінадукацыі. «Мала змяніць падыход да падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў рабочых і тэхнічных прафесій. Мы павінны па досведзе савецкага мінулага істотна падняць прэстыж інжынерных прафесій, павысіць статус тых людзей, чыімі рукамі і інтэлектам ствараюцца рэальныя матэрыяльныя каштоўнасці. Інакш усе нашыя планы застануцца пустымі паперкамі. Неабходна на справе ўмацаваць сувязь усіх узроўняў адукацыі — ад школы, ВНУ да прадпрыемства. Трэба працаваць па адзінай логіцы на агульны вынік. Крытэрыем эфектыўнасці навучальных устаноў павінна быць тое, наколькі запатрабаваныя выпускнікі, як растуць заработныя платы маладых спецыялістаў», — падсумаваў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што абазначаныя праблемы — гэта класічныя праблемы. Па ўсіх гэтых і іншых пытаннях трэба прыняць неабходныя рашэнні і, безумоўна, іх выканаць.

«Яшчэ раз хачу паўтарыць. Час сур'ёзны, патрабуе вельмі жорсткай дысцыпліны і самых актыўных дзеянняў ад кожнага», — сказаў ён і папрасіў прысутных дакладваць па сутнасці, з канкрэтнымі высновамі і прапановамі.

Неабходна развіваць галіновую навуку

Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ выказаў навуковы пункт гледжання на прамысловыя пытанні, назваўшы ключавыя праблемы. Ледзь не самая галоўная з іх — мадэрнізацыя вытворчасці. Па словах кіраўніка НАН, сёння патрабуецца скразны падыход да мадэрнізацыі, складання доўгатэрміновых планаў мадэрнізацыі, у тым ліку навукова-тэхнічны аўдыт. Адсюль вынікае і другая праблема — выкарыстанне лічбавых тэхналогій сучаснымі сістэмамі кіравання. Па словах Уладзіміра Гусакова, базавы навуковы патэнцыял ёсць, але патрэбны кадры.

Кіраўнік НАН закрануў тэму мадэрнізацыі выпуску кампанентаў машынабудавання і крытычнага імпарту. На яго думку, гэтая мадэрнізацыя стрымліваецца недастатковай станочнай базай, асабліва з лічбавым кіраваннем. Рашэнне гэтай праблемы — набыццё сучаснай станочнай базы з кіруючай электронікай і рабатызацыяй тэхналагічных ліній, а таксама ў імпартазамяшчэнні рэжучай прылады, у тым ліку цвёрдасплаўнай.

Уладзімір Гусакоў асобна вылучыў пытанне другаснага выкарыстання каштоўных адходаў вытворчасці як складальніка эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў. «Такія тэхналогіі сёння ў паскораным рэжыме адпрацоўваюцца ў НАН», — заўважыў ён.

Для таго каб усе пералічаныя мерапрыемствы давалі свой плён, па словах Уладзіміра Гусакова, неабходна пераходзіць не толькі на спецыяльныя тэхналагічныя рэжымы, а на тэхналагічныя стандарты, якія робяць тэхналагічныя працэсы строга рэгламентаванымі.

Айчынная тэхніка часам добрая, часам — не вельмі

Ад эфектыўнай працы прамысловасці напрамую залежыць і харчовая бяспека краіны. **Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей БАРТАШ** выказаў свае ацэнкі якасці сельскагаспадарчай тэхнікі. Ён падзяліў яе на тры групы. Першая — тэхніка з высокімі паказчыкамі надзейнасці, якая адпавядае сучасным патрабаванням. Напрыклад, збожжаўборачныя камбайны Гомсельмаш, трактары з магутнасцю рухавіка да 150 конскіх сіл Мінскага трактарнага завода, зернесушыльныя комплексы Амкадор і іх глебаапрацоўчая тэхніка. Другая катэгорыя — тэхніка, якая патрабуе нязначнай дапрацоўкі ў частцы надзейнасці. Галоўным чынам гэта электрааабсталяванне і гідраўліка. Трэцяя група — тэхніка, якая патрабуе прыняцця кардынальных мер па павышэнні яе надзейнасці і ўдасканалення. У асноўным гэта тэхніка Бабруйскаграмаш, тэхніка для ўнясення мінеральных угнаенняў.

Тэму сельскагаспадарчай тэхнікі ў сваім дакладзе працягнуў і **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.** Ключавой адзінкай у сельскагаспадарчай тэхніцы ён назваў энерганасычаны трактар, які заняты ў вытворчасці цэлы год. Прастой такой адзінкі тэхнікі ў перыяд правядзення масавых палявых работ — асенне-вясновая сяўба, нарыхтоўка кармоў — з'яўляецца крытычным для сельскагаспадарчага прадпрыемства. І, на жаль, энерганасычаныя трактары часта ламаюцца. Асноўнымі прычынамі паломкі тэхнікі з'яўляюцца выхад са строю гідраўлічнай сістэмы (19 працэнтаў выпадкаў) і няспраўнасць электрааабсталявання (17 працэнтаў).

У сваю чаргу, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на адносіны да тэхнікі і яе абслугоўванне, што напрамую звязана з працоўнай дысцыплінай. Складаныя, дарагія машыны, па яго словах, трэба аддаваць у гаспадаркі, дзе будуць забяспечаны адпаведныя ўмовы захоўвання, плануемага рамонту, абслугоўвання і эксплуатацыі. «Калі гэтага няма, будуць адмовы і будзе дрэнна працаваць. Абы-каму гэту тэхніку не аддасі», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Акцэнт будзе зроблены на высокатэхналагічны напрамак

Міністр прамысловасці Аляксандр РАГОЖНІК адзначыў, што разам з усімі негатыўнымі тэндэнцыямі за тры гады перавышаны арыенціры праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяцігодку. «Па выніках гэтых трох гадоў рост прамысловай вытворчасці склаўся на ўзроўні 140 працэнтаў пры арыенціры 124,6, па экспарце — 168 працэнтаў пры арыенціры 136,3», — адзначыў міністр.

«Экспарт — гэта тое, што вы на склады загналі і там валяецца? Ці гэта грошы вярнуліся вам?» — спытаў Прэзідэнт. Міністр запэўніў, што працэнт астаткаў пастаянна падае. Ёсць праблемы па халадзільніках і маразільніках, і трактарах. «Дык навошта вы адвезлі трактары за мяжу, калі яны Турчыну трэба, а вы іх адвезлі і там паставілі?» — спытаў Прэзідэнт.

Міністр прамысловасці расказаў, што ў мінулым годзе была прынята асаблівая праграма для беларускіх прадпрыемстваў. Пры ўмове аплаты 20 працэнтаў ад кошту трактара дадзена растэрміноўка да двух гадоў на ўвесь мадэльны рад. І кожная вобласць па гэтай праграме набывала тэхніку. Аднак гэтая праграма распаўсюджваецца не на ўсе мадэлі трактароў.

«Бягучае развіццё прамысловасці рэалізуецца праз інвестыцыйную і інавацыйную дзейнасць, павышэнне якасці прадукцыі, павышэнне яе канкурэнтаздольнасці. Акцэнт будзе зроблены на высокатэхналагічны напрамак: мікраэлектроніка, прыборабудаванне, вытворчасць аўтамабільнай сельскагаспадарчай, будаўнічай тэхнікі, легкавых аўтамабіляў і камплектавальных да іх, электратранспарт», — адзначыў Аляксандр Рагожнік. Паводле яго слоў, у планах на 2025—2030 гады распрацоўкі больш як дзвюх тысяч новых мадэляў і мадыфікацый. Міністр прамысловасці таксама адзначыў, што, выконваючы даручэнні Прэзідэнта, зроблены акцэнт на рэалізацыю праектаў у малых гарадах.

Задача нумар адзін — фарсіраванае індустрыяльнае развіццё

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА акцэнтаваў увагу на тым, што трэба мяняць структуру ўзаемадзеяння навукі і прамысловасці. «У нас ёсць галіновыя інстытуты. Ёсць навукова-практычныя цэнтры. Чаму яны працуюць у адрыве ад вытворчасці? У савецкі час была галіновая навука, якая напрацоўвала новыя тэхналагічныя рашэнні і перадавала на вытворчасці, якая іх увасабляла. Давайце хоць бы ў парадку эксперымента шэраг інстытутаў аддадзім тым, хто рэальна павінен карыстацца плёнам іх працы», — прапанаваў ён. Як прыклад — Аб'яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук. Яго супрацоўнікі жадаюць стварыць электрычны спарткар. Але прэм'ер-міністр выказаў сумненне, што такая прадукцыя будзе запатрабавана. «Няхай гэта будзе дызайн-бюро, якое будзе працаваць на інтарэсы Міністэрства прамысловасці і выконваць тыя задачы, якія патрэбны айчыннай прамысловасці», — сказаў кіраўнік урада.

Задачай нумар адзін для прамысловасці на канец бягучай пяцігодкі і на наступную Раман Галоўчанка назваў фарсіраванае індустрыяльнае развіццё. «Эканоміка на працягу найбліжэйшых гадоў будзе аб'ектыўна адчуваць дэфіцыт кадраў. Рашэнне толькі адно — павышэнне прадукцыйнасці працы і мадэрнізацыя прамысловасці. Што для нас стратэгія развіцця прамысловасці? Простыя рэчы — выручка, сабекошт, якасць, продажы, кадры і стварэнне новых вытворчасцяў высокіх тэхналагічных перадзелаў», — адзначыў ён.

Раман Галоўчанка расказаў, якія кірункі развіцця прамысловасці ўрад бачыць да 2030 года. Першы — мікраэлектронная прамысловасць. Другі — вытворчасць электратранспарту. Раман Галоўчанка нагадаў, што ідзе рэалізацыя пілотных праектаў у Шклоўскім і Жодзінскім раёнах. На чарзе Наваполацк і далей па краіне. Па словах прэм'ер-міністра, усе планы, якія стаяць перад прамысловасцю, зразумелыя. Задача адна — іх рэалізаваць. Пры гэтым найважнейшым пытаннем застаецца якасць прадукцыі.

Зроблена нямала, але гэтага недастаткова

Падводзячы вынікі нарады, Аляксандр Лукашэнка растлумачыў сваю пазіцыю, якая ў некаторых момантах можа падацца нават жорсткай: «Час няпросты, і тое, што мы сёння ў такім ключы абмяркоўваем задачы на перспектыву (практычныя, стратэгічныя), сведчыць аб тым, што зроблена нямала. І я вам удзячны за тое, што зроблена. Усім тым, хто дадаваў у гэты час. Але сутнасць у тым, што зробленага мала. Усё, што мы дасягнулі, — дзякуй, добра. Але гэта вельмі нядосыць». Ён зазначыў, што адказныя асобы мала абмяркоўваюць праблемы, якія павінны вырашаць.

«Усе патрабавалі больш паўнамоцтваў, вось вам паўнамоцтвы, дзейнічайце, эканоміка ў вашых руках — тых, хто сядзіць тут і ва ўрадзе. Плюс іншыя сектары (прадстаўнікі, кіраўнікі сельскай гаспадаркі і іншых). Дзейнічайце!» — заклікаў ён.

Прэзідэнт прызнаў, што на знешніх рынках працаваць няпроста. Сёння ў прынцыпе няма свабодных рынкаў, усюды вялікая канкурэнцыя.

Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на праблему пасрэдніцтва. Ён даручыў запланаваць і падрыхтаваць нараду на ўзроўні Прэзідэнта па ліквідацыі пасрэдніцтва. Ён расказаў, што нядаўна гутарыў з адным з аграрыяў, і аказалася, што той закупляе хімікаты, насенне і іншае ў Расіі. У Беларусі, паводле яго слоў, усё гэта таксама ёсць, але з-за пасрэднікаў кошт у тры разы вышэйшы. «Недзе немагчыма абысціся без гэтых пасрэднікаў, — заўважыў Прэзідэнт. — Няхай міністр прыме рашэнне, ён будзе несці адказнасць. Ці ён нейкую сістэму празрыстую ўсталюе, каб мы бачылі, што там адбываецца».

«Мы з вамі правялі сур'ёзную размову прыкладна па ўсіх праблемах, якія сёння стаяць перад прамысловымі прадпрыемствамі. Кожны з нас павінен бачыць мэту, заданне, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я агітую за тое, што разумна, не спяшаючыся трэба вярнуцца да канкрэтных вытворчых заданняў, хоць мы ніколі, у вялікім сэнсе слова, ад гэтага не адыходзілі. Але недзе ўсё гэта закінулі, выкінулі. Таму павінны быць канкрэтныя задачы».

Валерыя СЦЯЦКО.

СТАЎКА НА КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларускія геолагі летась пасля сейсмаразведачных работ знайшлі новыя запасы нафты. Па словах Марыі Шастак, пасля работ на нафтаперспектыўнай структуры «Жукоўская» забяспечаны прырост рэсурсаў нафты (па катэгорыі D0) у колькасці 457 тысяч тон.

Як паведамілі ў Навукова-вытворчым цэнтры па геалогіі (НВЦ), усяго на пачатак гэтага года ў Беларусі адкрыта і разведана 96 радовішчаў нафты. У 2023 годзе «чорнага золата» здабыта 1,877 мільёна тон, што значна больш, чым у папярэднія гады. У НВЦ па геалогіі падлічылі, што на бягучы момант рэшткавыя прамысловыя вымальныя запасы нафты складаюць 44,8 мільёна тон. Толькі з 2015 да 2023 года адкрыта 14 радовішчаў нафты.

Што датычыцца інвестпраектаў, можна адзначыць праект «Беларуснафты» ў Маларыцкім раёне па здабычы і перапрацоўцы пяску на радовішчы «Хаціслаўскае». Пясок будзе выкарыстоўвацца для гідраразрыву пласта і павышэння аддачы пры здабычы нафты», — праінфармавала Марыя Шастак.

Мел, пясок і гліна

Летась завершана дэталёвая разведка пяску для вытворчасці сілікатных вырабаў на ўчастку радовішча «Слабада» ў Мінскім раёне. Там былі падлічаны яго запасы ў колькасці 7,2 мільёна тон. «Гэтыя запасы будуць рэзервовай сыравіннай базай для Мінскага камбіната сілікатных вырабаў, бо радовішча размяшчаецца досыць блізка», — адзначыла Марыя Шастак.

Паводле яе слоў, таксама выяўлены перспектыўныя ўчасткі мелу, які можа выкарыстоўвацца для вытворчасці цэменту, у радыусе 40 кіламетраў ад ААТ «Краснасельскбудматэрыялы». Гэтыя ўчасткі могуць быць рэзервовай сыравіннай базай на перспектыву для развіцця гэтага прадпрыемства.

Акрамя таго, праведзены работы да вывучэння радовішчаў пяску, які выкарыстоўваецца ў шкляной галіне. У асноўным радовішчы размешчаны паблізу ААТ «Гомельшкло» — філіяла Гомельскага ГАКа. Выяўлены найбольш перспектыўны ўчастак — радовішча «Усохскае».

Спецыялісты займаліся і ўдасканаленнем тэхналагічных рашэнняў у галіне здабычы і перапрацоўкі глін радовішча «Крупейскі сад» у Лоеўскім раёне. Яго распрацоўвае «Лоеўбудматэрыялы». Даследаванні пацвердзілі, што на глыбіні 6-8 метраў залягае пласт глін, якія прыдатныя для вытворчасці керамічных вырабаў. «На жаль, пласт залягае досыць глыбока. Рашэнне аб здабычы будзе прымаць кіраўніцтва прадпрыемства ва ўзаемадзеянні з Мінпрыроды, Гомельскім аблвыканкамам у залежнасці ад эканамічных паказчыкаў, запатрабаванасці і магчымасці здабычы глін», — дадала Марыя Шастак.

Таксама ў 2023 годзе даследавалі радовішча кааліну «Сітніца». Па даручэнні ўрада радовішча плануецца да ўводу ў распрацоўку ў 2024 годзе. Пачаліся і работы па даследаванні радовішча бентанітавых глін «Астражанскае», цяпер яны працягваюцца. «Да канца 2025 года па ўсіх радовішчах, названых у пераліку, будуць падрыхтаваны тэхніка-эканамічныя абгрунтаванні мэтазгоднасці ўводу ў распрацоўку», — удакладніла прадстаўнік Мінпрыроды.

На думку Марыі Шастак, беларускія прадпрыемствы імкнуцца больш выкарыстоўваць айчынную сыравіну, павялічваць аб'ёмы яе здабычы, рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты. «Фіксуецца павелічэнне здабычы шкляных пяскоў, калійных соляў, будаўнічага і абліцовачнага каменя.

Па базальтах ходзім

Па словах кансультанта, летась завяршыліся пошукавыя работы па выяўленні радовішчаў базальтаў з глыбінёй залягання да 100 метраў у межах Пінскай і Іванаўскай плошчаў Брэсцкай вобласці. Выяўлены рэсурсы базальтаў у аб'ёме 648 мільёнаў тон.

Варта нагадаць, што летась ва ўзаемадзеянні з Мінбудархітэктуры, Нацыянальнай акадэміяй навук, тэхналагічнымі ўніверсітэтамі Мінпрыроды арганізавала мерапрыемствы, накіраваныя на пашырэнне пераліку здабывальных відаў карысных выкапняў, якія максімальна скарачаюць імпарт.

У тым ліку ўдасканальваюцца тэхналогіі здабычы карысных выкапняў і распрацоўкі радовішчаў. Так, распараджэннем прэм'ер-міністра Беларусі ў мінулым годзе быў зацверджаны пералік перспектыўных радовішчаў. У іх лік увайшлі радовішчы кааліну «Сітніца», бентанітавых глін «Астражанскае», базальтаў «Навадворскае», баксіт-даўсанітавых руд «Заазернае».

«Што датычыцца радовішча «Навадворскае», летась завершана дэталёвая разведка, яно падрыхтавана да прамысловага асваення. Па выніках распрацаванага тэхніка-эканамічнага абгрунтавання пацверджана мэтазгоднасць ўключэння гэтага радовішча ў распрацоўку са стварэннем горнаабагачальнага камбіната (ГАКа) магутнасцю 250 тысяч тон у год. Паралельна са стварэннем камбіната плануецца стварэнне некалькіх вытворчасцяў па выпуску прадукцыі з базальтаў: мінералаватных пліт, базальтавага бесперапыннага валакна, а таксама элементаў добраўпарадкавання. Прапрацоўваецца пытанне аб вызначэнні арганізацыі-заказчыка па праектаванні дадзенага ГАКа», — расказала Марыя Шастак.

Яна адзначыла, што запуск поўнага цыкла вытворчасці (распрацоўка кар'ера, будаўніцтва яшчэ трох прадпрыемстваў) дазволіць цалкам замясціць імпарт базальту ў нашай краіне ў аб'ёме 75-80 тысяч тон у год і стварыць не менш чым 400 працоўных месцаў.

Планы на перспектыву

Сёння геолагі ў пошуку новых радовішчаў карысных выкапняў адкрываюць «усю табліцу Мендзялеева», але пытанне ў тым, што вялікую іх колькасць распрацоўваць эканамічна не выгадна.

Напрыклад, як расказаў начальнік аддзела геалогіі і мінералогіі крышталічнага падмурка філіяла «Інстытут геалогіі» НПЦ па геалогіі Алег Піскун, у краіне ёсць залежы берылію, які актыўна выкарыстоўваецца ў авіяцыйнай галіне і металургіі. Ёсць адкрытыя яшчэ ў часы СССР залежы іншых металічных руд, але размешчаны яны на глыбінях, якія не дазваляюць здабываць іх з прыбыткам. Ці, напрыклад, ёсць у нашых глыбінях рэдказямельныя металы, а таксама золата, плаціна, медзь і серабро. Толькі размешчаны яны на глыбіні 5-6 кіламетраў.

Але ёсць і тыя карысныя выкапні, здабыча якіх выгадная. Распараджэннем прэм'ер-міністра зацверджаны пералік радовішчаў карысных выкапняў, перспектыўных для новай распрацоўкі. «На 2024-2025 гады ў рамках дзяржпраграмы чакаецца прырост прагнозных рэсурсаў нафты ў колькасці 550 мільёнаў тон, пяску для вытворчасці шкла — 19 мільёнаў тон, гліны тугаплаўкай — 6,9 мільёна тон», — прывяла зацверджаныя планы прадстаўнік Мінпрыроды.

Інтэрактыўная карта мінеральна-сыравіннай базы

Таксама працягвалася геалагічнае карціраванне тэрыторыі краіны. «Такія працы спрыяюць павышэнню ўзроўню геалагічнай вывучанасці Беларусі і аблічбоўкі даных. Выпускаюцца карты новага пакалення. Геалагічнае карціраванне дазваляе сфарміраваць новае ўяўленне аб геалагічным будынку нашай краіны з улікам забудовы, змены ландшафту. Выкарыстанне гэтых карт будзе спрыяць больш дэталёвай прапрацоўцы далейшых даследаванняў, вывучэнню новых перспектыўных плошчаў», — звярнула ўвагу прадстаўнік Мінпрыроды. Усё гэта трэба, але...

Каб мець аператыўную, даступную і актуальную інфармацыю аб стане мінеральна-сыравіннай базы, у краіне па даручэнні ўрада і Мінпрыроды пачата распрацоўка інтэрактыўнай карты. Сёння сістэма праходзіць тэставую эксплуатацыю і да канца года будзе запушчана ў адкрытым доступе. Як адзначыла дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны цэнтр па геалогіі» Марына Васілюк, дадзеная сістэма дазволіць вырабляць выбарку па розных крытэрыях тых ці іншых участкаў нетраў, адлюстроўваць іх на картаграфічнай аснове і аўтаматычна фарміраваць аналітычныя даведкі аб стане выбраных аб'ектаў або аб стане мінеральна-сыравіннай базы абранага рэгіёна.

Сяргей КУРКАЧ.

Статусбанк

ОАО «СтатусБанк»

www.stbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
31 марта 2024 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2024 год	2023 год
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	74 076	41 139
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	33 133	32 941
5	Средства в банках	1104	154 199	154 512
6	Ценные бумаги	1105	-	-
7	Кредиты клиентам	1106	108 120	91 513
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	7 421	7 172
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	-	-
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	1 888	2 206
15	**ИТОГО активы**	**11**	**378 837**	**329 483**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	-	133
19	Средства клиентов	1203	291 331	246 209
20	Ценные бумаги банка	1204	-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	3 050	2 305
24	ВСЕГО обязательства	120	294 381	248 647
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	43 000	43 000
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	14 885	14 131
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	73	73
30	Накопленная прибыль	1215	26 498	23 632
31	ВСЕГО собственный капитал	121	84 456	80 836
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**	**378 837**	**329 483**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за 1-й квартал 2024 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2024 год	2023 год
1	Процентные доходы	2011	5 833	3 947
2	Процентные расходы	2012	2 382	762
3	Чистые процентные доходы	201	3 451	3 185
4	Комиссионные доходы	2021	1 425	764
5	Комиссионные расходы	2022	1 061	455
6	Чистые комиссионные доходы	202	364	309
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	7 999	1 470
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	761	(964)
12	Прочие доходы	208	144	300
13	Операционные расходы	209	5 947	4 535
14	Прочие расходы	210	228	167
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	5 022	1 526
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	1 402	228
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**3 620**	**1 298**

Председатель Правления

Главный бухгалтер

Дата подписания: 2 апреля 2024 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 выдана Национальным банком Республики Беларусь 26 февраля 2024 года. УНП 807000043.

ПАМЯТАЕМ, ШАНУЕМ, КЛАПОЦІМСЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Адна з галоўных і чаканых мер падтрымкі — выплата штогадовай матэрыяльнай дапамогі, якая рэалізуецца з 2021 года паводле ўказа Прэзідэнта. Сёлета выплата матэрыяльнай дапамогі будзе праходзіць з 25 красавіка да 4 мая. Яе памеры ў параўнанні з мінулым годам павялічыліся. Для ўдзельнікаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны матэрыяльная дапамога складзе чатыры тысячы рублёў, для іншых катэгорый ветэранаў — дзве тысячы рублёў; грамадзяне, якія аднесены да асоб, што пацярпелі ад наступстваў вайны, — адна тысяча рублёў. У цэлым на аказанне дапамогі сёлета ў рэспубліканскім бюджэце прадугледжана больш за 10,5 мільёна рублёў, — паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына КАЛЯДА.**

Адна з істотных мер падтрымкі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны рэалізуецца праз пенсіённае забеспячэнне. Сёння сумарны памер штомесячнай выплаты да пенсіі ўдзельнікам і інвалідам вайны ў выглядзе павышэння ўзроставых даплат, надбавак на догляд складае ў сярэднім амаль 600 рублёў, іншым катэгорыям ветэранаў — каля 250 рублёў. У красавіку сярэдняя пенсія па ўзросце ўдзельнікаў і ветэранаў вайны складае больш як 1,2 тысячы рублёў, адносна інвалідаў вайны — больш як 1,35 тысячы рублёў.

Усім ветэранам, якія маюць патрэбу ў дадатковых мерах падтрымкі, у стараннай дапамозе з улікам узросту, аказваюцца розныя формы сацыяльнага абслугоўвання. Тыя ветэраны, якія маюць патрэбу ў пастаянным кругласутачным доглядзе, у тым ліку медыцынскай дапамозе, пражываюць у сацыяльных пансіянатах. Сёння гэта каля 40 чалавек. Сацыяльныя паслугі дома атрымліваюць больш як 330 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, 85 ветэранаў атрымліваюць догляд родных у сувязі з патрэбай у пастаяннай старонняй дапамозе. Пры гэтым іх блізкім выплачваецца дапамога.

Штогод у рамках дзяржаўнай праграмы і ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта праводзіцца абследаванне ўмоў пражывання ветэранаў для выяўлення патрэбнасці ў аказанні дадатковых мер падтрымкі. Сёлета першаснае абследаванне завяршылася 20 сакавіка.

— Усіх ветэранаў мы наведалі дома, вывучылі ўмовы іх пражывання і патрэбнасць у аказанні мер падтрымкі. Гэтае пытанне з парадку дня ў нас не здымаецца ніколі. Як паказалі вынікі абследавання, нашы ветэраны жывуць у асноўным у дастаткова камфортных умовах, і сёння нейкія істотныя меры падтрымкі для паляпшэння якасці жыцця не патрабуюцца. Непасрэдна мясцовыя органы ўлады пастаянна адсочваюць сітуацыю, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, вядома, знаходзяцца на асаблівым кантролі. У рамках гэтай работы, каб не прапусціць праблемныя моманты, якія ўзнікаюць, мы прадугледзелі штомесячны маніторынг умоў пражывання, — расказала Кацярына Каляда.

Яшчэ адна катэгорыя мер падтрымкі ветэранаў — дзяржаўныя сацыяльныя льготы. Яны прадугледжаны па розных кірунках: у сферы аховы здароўя, жыллёвай сферы, бясплатны праезд. Адной з важкіх мер падтрымкі з'яўляецца штогадовае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне. Летась гэтай паслугай скарысталася каля трох дзясяткаў ветэранаў.

— Улічваючы, што нашым ветэранам ужо амаль сто гадоў і па стане здароўя далёка не кожны можа скарыстацца такой мерай падтрымкі, для інвалідаў і ўдзельнікаў вайны прадугледжана грашовая дапамога на аздараўленне, гэта значыць, тым, хто не скарыстаўся санаторна-курортным лячэннем, аказваецца матэрыяльная дапамога ў памеры 10 базавых велічынь. У мінулым годзе такую грашовую дапамогу атрымалі амаль 550 чалавек на суму больш як 200 тысяч рублёў.

Алена КРАВЕЦ.

Партнёрства

У МАГІЛЁЎШЧЫНЫ ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ

11 красавіка на ВДНГ у Маскве адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дням Магілёўскай вобласці

Тое, што патэнцыял Прыдняпроўскага краю вялікі, наведвальнікі павільёна Рэспублікі Беларусь на ВДНГ у Маскве ўжо змаглі пераканацца. Магілёўская вобласць гаспадарыць на выстаўцы з 29 сакавіка. Тут ёсць чым уразіцца і захапіцца. Прыдняпроўскі край вядомы сваімі буйнымі прамысловымі і сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, багатай культурна-гістарычнай спадчынай, унікальнай прыродай.

Адной з яркіх візітовак вобласці з'яўляецца купальскае свята «Александрыя збірае сяброў», на якім вельмі ярка прадстаўлена ўся палітра сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця не толькі рэгіёна, але і краіны. Найлепшыя ўзоры машынабудавання, лёгкай прамысловасці, грамадскага харчавання, скарбы народнай спадчыны, дасягненні ў мастацтве — усё гэта складнікі вялікага рэспубліканскага купальскага свята. Не дзіўна, што адны з яго персанажаў — кум і кума ў народных строях — стануць падчас урачыстых мерапрыемстваў праваднікамі высокіх гасцей па выстаўцы вобласці.

У наведвальнікаў будзе магчымасць паспрабаваць лепшыя ўзоры прадукцыі Магілёўскага мясакамбіната, малочнага холдынга «Бабушкіна крынка», хлебабулачных вырабы прадпрыемства «Дамачай». У стацыянарных крамах выставачнага павільёна шырока прадстаўлены асартымент вядучых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці: «Магатэкс», «Стужка», «Славянка», «Бабруйсктрыкатаж». Узоры сваёй прадукцыі прадэманструюць буйны вытворца ліфтавага абсталявання ААТ «Магілёўліфтмаш», прадпрыемствы машынабудаўнічай галіны ААТ «Белшына», «Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў» і іншыя.

Магілёўшчына — гэта яшчэ і «Край жыватворных крыніц». Пад такім брэндам прадстаўлены багаты прыродны і турыстычны патэнцыял вобласці. Сапраўдная жамчужына рэгіёна — Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль, які быў адноўлены, дзякуючы рэспубліканскай праграме. На ролах можна ўбачыць, якія багатыя яго інтэр'еры і ўбранне залаў. Пра сялянскі быт Магілёўшчыны расказваюць упрыгожаная ўзорамі ткацтва, вышыўкі і іншых вырабаў народнага ўжытку «беларуская хатка». Нельга не захапіцца саматканымі дываномі і ручнікамі таленавітых майстроў Прыдняпроўя.

З Магілёвам звязана шмат вялікіх гістарычных падзей. Адна з іх датычыцца Першай сусветнай вайны, калі на два гады вышэйшае ваеннае кіраўніцтва Расійскай арміі пераехала ў прыфрантавы губернскі горад. Перанесціся ў перыяд пачатку XX стагоддзя дапаможа выстаўка «Царская стаўка ў Магілёве».

Магілёўшчына беражліва адносіцца да захавання памяці аб героях Вялікай Айчыннай вайны. І адно з галоўных воінскіх месцаў славы — гэта Буйніцкае поле пад Магілёвам, дзе на 23 дні быў затрыманы наступ ворага. Летась на міжнароднай канферэнцыі «Гэта трэба — не мёртвым! Гэта трэба — жывым», якая праходзіла ў Магілёве, саюзы пісьменнікаў Беларусі і Расіі выступілі з ініцыятывай заснавання літаратурнай прэміі «Буйніцкае поле». Старшыні пісьменніцкіх арганізацый дзвюх краін выказалі меркаванне, што прэмія стане добрым стымулам для падтрымкі сучаснага літаратурнага працэсу ў Саюзнай дзяржаве і заахвочвання таленавітых аўтараў. Сузаснавальнікам прэміі выступіў таксама Магілёўскі аблвыканкам.

У рамках урачыстых мерапрыемстваў Дзён Магілёўскай вобласці адбудзецца прэзентацыя Міжнароднага маладзёжнага патрыятычнага праекта «Дарогамі Памяці і Славы». Яго арганізатарам выступае Магілёўскі абкам БРСМ пры асабістай падтрымцы старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі. Асноўная задача праекта — захаванне гістарычнай памяці, яднанне моладзі дзеля будучыні, міру і стварэння. У яго рамках адбываюцца адкрытыя дыялогі, закладванні паркаў і сквераў Памяці і Славы, ускладаюцца кветкі да воінскіх мемарыялаў, ладзяцца сустрэчы і канцэрты. Летась праект праводзіўся ў другі раз, яго ўдзельнікамі сталі прадстаўнікі маладзёжных арганізацый з Ленінградскай, Смаленскай, Бранскай, Астраханскай абласцей і Хабараўскага краю Расіі.

Плённа развіваецца супрацоўніцтва Магілёўшчыны з рэгіёнамі рэгіёнамі. Толькі за 2020—2023 гады суб'ектамі Магілёўскай вобласці ў рэгіёны Расійскай Федэрацыі накіравана інвестыцый на агульную суму 47 мільярдаў расійскіх рублёў — каля 90 % усіх інвестыцый вобласці за мяжу за гэты перыяд. З 2020 года з удзелам расійскага капіталу на тэрыторыі Магілёўскай вобласці рэалізавана восем праектаў у сферах машынабудавання, хімічнай прамысловасці, адукацыі, сельскай гаспадаркі і перапрацоўкі сельгаспрадукцыі. На іх рэалізацыю накіравана больш за 11 мільярдаў расійскіх рублёў, створана каля 730 працоўных месцаў. Патэнцыял вялікі, і абодва бакі шукаюць новыя шляхі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. 11 красавіка запланавана падпісанне двухбаковых дакументаў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным, культурным і прымежным супрацоўніцтве на 2024—2026 гады паміж Магілёўскім аблвыканкамам і адміністрацыяй Бранскай вобласці, а таксама аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве паміж Магілёўскай і Курскай абласцямі. Магілёўскі абкам БРСМ намераны падпісаць Пагадненні аб супрацоўніцтве з раённымі арганізацыямі Расійскага саюза моладзі Калужскай, Курскай, Тульскай, Мардоўскай абласцей, а таксама Масквы.

Удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных Дням Магілёўскай вобласці ў беларускім павільёне на ВДНГ, возьмуць Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Крутой, іншыя высокія госці.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Тайланд прапанаваў аналаг шэнгена для шасці краін Паўднёва-Усходняй Азіі

Тайланд прапанаваў запусціць сумесную візу для сябе і яшчэ пяці краін Паўднёва-Усходняй Азіі (Камбоджы, Лаоса, Малайзіі, М'янмы і В'етнама), каб развіваць комплексны турызм з наведваннем некалькіх дзяржаў у рамках аднаго падарожжа. Аб гэтым паведаміла газета VN Express. Як адзначае выданне, ініцыятыва паступіла ад прэм'ер-міністра Тайланда Сетхі Тхавісіна, і яго калегі з іншых краін пазітыўна паставіліся да прапановы. У сваю чаргу, былы прэзідэнт Асацыяцыі атэляў Тайланда Марыса Сукасол лічыць, што для ўвядзення такой візы неабходна павялічыць тэрмін знаходжання з цяперашніх 30 дзён да 90, каб зрабіць прывабным падарожжа. Як паведаміла VN Express, летась шэсць краін Паўднёва-Усходняй Азіі прынялі ў агульнай складанасці 70 мільёнаў замежных турыстаў. Найбольшая колькасць, што адмовілася ад віз для турыстаў з Кітая і Індыі, адпачыла ў Тайландзе і Малайзіі.

Еўрапол выявіў больш чым 820 злачынных груповак

Еўрапейскае паліцэйскае агенцтва (Еўрапол) выявіла 821 злачынную арганізацыю, якія пагражаюць Еўрасаюзу. У іх уваходзіць 25 тысяч чалавек 112 розных нацыянальнасцяў. Прыкладна палова з іх звязана з наркагандлем. Аб гэтым паведаміла ТАСС. Даклад, які ахоплівае ўсе сферы незаконнай дзейнасці, быў зроблены ўпершыню. Паводле яго даных, 86 працэнтаў асноўных злачынных суполак удзельнічае ў легальным бізнесе, адмываючы такім чынам даходы, паведаміў Euronews. Злачынныя суполкі пранікаюць у легальны бізнес на тэрыторыі Еўрасаюза з дапамогай карупцыі. Інфармацыя, атрыманая ад усіх краін Еўрапола, дала магчымасць скласці карту і прааналізаваць дзейнасці злачынцаў на еўрапейскім узроўні.

Брытанскі марафонец прабег праз усю Афрыку

Рас Кук, 27-гадовы жыхар Вялікабрытаніі, які захапляецца экстрэмальнымі відамі марафону, стаў першым у свеце чалавекам, які прабег праз увесь Афрыканскі кантынент. Падарожжа заняло 352 дні, а адлегласць, якую ён пераадолеў, перавысіла 16 тысяч кіламетраў. Пра гэта паведаміла Associated Press. Небяспечны для жыцця тур англійскі спартсмен пачаў 22 красавіка мінулага года ў ПАР з самага паўднёвага пункта Афрыкі — пасёлка Л'Агульяс, размешчанага на мысе Агульяс (Ігольны), а фінішаваў у Тунісе. Ён перасёк джунглі і пустыню, аб'ехаў зоны баявых дзеянняў, атрымаў мноства траўмаў, а таксама вырашаў праблемы з візамі. Першапачаткова ён планаваў справіцца за 240 дзён, аднак рабаванне яго і каманды ў Анголе, дзе былі скрадзены абсталяванне і пашпарты, а таксама сур'ёзныя болі ў спіне змянілі планы. Як адзначыў падарожнік, ён наведаў 16 краін і вельмі стаміўся. Раней ён ужо пераадольваў 3 тысячы кіламетраў ад Стамбула да Уортынга за 68 дзён.

Нашы аўтары

Фантастычны сусвет Алёны Беланожка

Пісьменніца прэзентавала сваю новую кнігу магілёўскім чытачам

Алёну Беланожка ведаюць нават тыя, хто яе кніжак не чытаў. Яна аўтар сцэнарыяў культурна-відовішчных мерапрыемстваў, тэатралізаваных канцэртаў. Песні на яе тэксты спяваюць вядомыя беларускія артысты, а дзеці глядзяць забаўляльныя прадстаўленні, пастаўленыя па Алёніных творах. Гэта не работа як вядучага рэдактара Магілёўскай абласной філармоніі. А вось літаратура — захапленне. Алёна — адна з найцікавейшых маладых пісьменніц нашага часу. Напрыканцы мінулага года ў выдавецтве «Звязда» выйшаў зборнік яе фантастычных апавяданняў пад назвай «Дзіця Зямлі». Падчас нядаўняй прэзентацыі кнігі ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У. Леніна аўтар падзялілася разважаннямі, як нараджаюцца сюжэты і дзе яна чэрпае натхненне для сваёй творчасці.

У стылі Рэя Брэдберы

Яе канёк — сацыяльная фантастыка. Як, напрыклад, у Рэя Брэдберы, які ёй вельмі падабаецца. Прызнаецца, што любіць гэты жанр і вельмі камфортна сябе ў ім адчувае. А новая кніга, па яе словах, — гэта тое, ва што ўкладзена ўсё яе сэрца.

— Тут 15 апавяданняў, якія выходзілі ў розных выданнях, у тым ліку часопісах «Бярозка», «Маладосць», зборніках «Мастацкай літаратуры» на працягу апошніх 10 гадоў, — расказвае яна. — Я паслухалася рэдактара часопіса «Маладосць», якая на пачатку маёй актыўнай літаратурнай дзейнасці параіла: «Не спяшайцеся напісаць адразу вялікі зборнік і яго выдаць. Лепш, калі будзеце друкавацца ў розных выданнях, і потым, калі набярэцца нейкая крытычная маса, зробіце зборнік. У вас ужо будзе імя, вы папрацуеце з рознымі рэдактарамі». І я ёй вельмі ўдзячная за параду. За дзесяць гадоў у мяне назбіралася нават болей, чым на адну кнігу. Некаторыя апавяданні ўвайшлі сюды, яшчэ частка засталася — берагу на наступны зборнік.

— У кнізе цікавая вокладка — гэтакая маленькая, але вельмі ўпэўненая ў сабе жанчына на фоне ракеты, што ўзлятае ў космас...

— Ілюстратар Дар'я Камейша трапіла ў самы яблычак (*усміхаецца*). Мне падабаецца працаваць з выдавецтвам «Звязда», таму што тут заўсёды прапануюць варыянты афармлення кнігі. Мне прысылалі на ўзгадненне адразу тры варыянты вокладкі. І малюнак, які я выбрала, — абсалютна тое, што трэба. Два іншыя таксама былі выдатныя, але гэты — бляск. Тут і колер, і атмасфера...

— Алёна, а што часцей за ўсё становіцца прадметам вашых літаратурных даследаванняў?

— Я не пішу пра жыццё на іншых планетах — я звяртаюся да магчымых варыянтаў развіцця цывілізацыі тут, на нашай планеце. Што можа адбыцца, да чаго прыводзяць сацыяльныя і навуковыя эксперыменты? Напрыклад, генетычныя. Генетыка мяне наогул вельмі цікавіць. «Дзіця Зямлі» — апавяданне якраз пра гэта. Яно і дало назву ўсяму зборніку. Усе апавяданні — мая рэфлексія наконт нашага прызначэння, таго, што можа адбыцца, калі мы яго не выканаем.

— І што можа адбыцца?

— Я той аўтар, у якога не абыходзіцца без ахвяр. Нават калі фінал светлы, ахвяры там усё роўна будуць. Гэта як свяшчэнная ахвяра. Не бывае цывілізацыйных або ваенных дасягненняў без ахвяр, а іх памеры залежаць ад таго, чаго мы хочам дасягнуць. Ёсць у мяне апавяданне «Словы пра жыццё», дзе два цяжка параненыя на вайне салдаты ляжаць у коме, а анёлы-ахоўнікі ўспамінаюць іх жыццё, якія яны добрыя справы здзейснілі, чым жылі. І — чакаюць сігналу, каму з гэтых маладых людзей будзе дазволена застацца на зямлі, а каму прыйдзецца сысці ў небыццё.

Або ўзяць, напрыклад, апавяданне «Белы дом». Яно пра тое, як творчыя людзі стварылі ідэальнае грамадства. Але ўсё разбурылася з-за аднаго вельмі дапытлівага журналіста, які тайна трапіў туды і зрабіў рэпартаж. Асабіста мне падабаецца аповед «Місія «Сонца»» — класічная фантастыка пра тое, як навукоўцы ляцяць да іншых планет для таго, каб праводзіць навуковыя эксперыменты і запальваць штучныя сонцы, зоркі, планеты. Місія аказваецца пад пагрозай, але яе ўсё ж такі атрымліваецца выратаваць.

Песні, замовы і шмат беларускай мовы

Алёна Беланожка па адукацыі рэжысёр абрадаў і свят, у сферы культуры працуе больш чым 18 гадоў. Большасць літаратурных тэкстаў, сцэнарыяў, вершаў выходзіць з-пад яе пяра менавіта на беларускай мове. А літаратурныя творы наогул спрэс беларускамоўныя.

— Гэта натуральна, калі беларускі пісьменнік піша на роднай мове, — разважае яна. — Я сябе вельмі камфортна ў ёй адчуваю. Мне падабаецца беларускі гукапіс. Кожная мова сваім гукапісам на людзей па-свойму ўплывае. Для мяне беларуская мова — мова замоў. Вось як на мяне бабуля шаптала ў дзяцінстве. Усе пісьменнікі — крыху магі, чараўнікі — усё, што намі напісана на такой чароўнай мове, спраўджваецца.

— А казкі вы часам пішаце?

— Казкі не пішу. Гэта вельмі складаны жанр. Каб напісаць казку, трэба быць вельмі добрым майстрам, таму што казка працуе з архетыпамі. І вельмі добра трэба разумець псіхалогію адраснай аўдыторыі, гістарычны, культурны падмурак, які свой у кожнага народа. Беларуская фантастыка таксама мае асаблівасці, бо ў нас свае культурныя карані, сваё светаўспрыманне. На чым мы выраслі? На нашай беларускай міфалогіі, фальклоры, культуры... Мы бачым будучыню праз прызму свайго светапогляду. Гэта вельмі цікава перажываць і асэнсоўваць.

Большасць маіх песень, а іх у мяне зарэгістравана ў аўтарскім таварыстве каля 200, таксама на роднай мове. Іх спяваюць нашы артысты, напрыклад, Вольга Гарнічар, ансамблі «Медуніца», «Церніца», «Весялуха», шоу-група «Тып-Топ», Узорная дзіцячая студыя «Вясёлыя ноткі» — спіс можна працягваць.

Да сюжэта праз навуковыя эксперыменты

Суразмоўніца прызнаецца, што калі б яна не аддала перавагу культуры, то абавязкова стала б генетыкам. Гэта тая сфера, якая ёй падабаецца не менш, чым літаратура. Яна шмат увагі аддае навуковым перадачам, якія потым даюць ёй пажытак для літаратурных сюжэтаў.

— Я вельмі люблю слухаць лекцыі, напрыклад, Вячаслава Дубыніна. Вывучаю, як працуюць нейрамедыятары, каб ведаць, як наш мозг рэагуе на тое ці іншае, якія працэсы ў арганізме адказваюць за радасць, голад, пачуцці... Мне гэта трэба, каб з разуменнем напісаць пра той жа мозг і мяне потым не засмяялі. З вялікім задавальненнем гляджу лекцыі па астраноміі. Мяне цікавяць зоркі, неба. Удзельнічаю ў валанцёрскіх праектах SETI, якія датычацца пошуку іншаземных цывілізацый, і Einstein@Home па праверцы гіпотэзы Эйнштэйна аб існаванні гравітацыйных хваль. Спадзяюся, што калісьці і я адкрыю сваю зорку. Кожны ахвотны можа далучыцца да гэтых праграм і дапамагаць развіваць нашу цывілізацыю. Вельмі добрая магчымасць з карысцю задзейнічаць нашы камп'ютары і смартфоны, а не абмяжоўвацца пошукам прыгожых малюнкаў і перапіскамі ў сацыяльных сетках.

— Незразумела толькі, як пры такой любові да генетыкі і розных цывілізацый культура перамагла.

— Напэўна, ёсць нейкае наканаванне. Спрабуеш звярнуць са сваёй каляіны, а цябе, як кацяня, нехта за шкірку — і назад.

— А хто гэты нехта?

— Здаецца, што мы ўсе прыйшлі ў гэты свет з нейкай задумай, якую не зможам зразумець, пакуль не дойдзем да канца зямнога шляху. Потым абернемся і зразумеем, для чаго ўсё гэта было. Ёсць такі выраз: «Рабі тое, што табе даецца найлепш за ўсё, але рабі гэта з усіх сіл». Напэўна, калі нешта атрымліваецца, трэба гэта і рабіць.

— А помніце, калі і з чаго пачаліся вашы першыя літаратурныя крокі?

— Як толькі навучылася чытаць, адразу ж пачала пісаць. Пра зайца-выхваляку пачытала, трэба ж і сваю версію напісаць. А мае сачыненні ў школе былі такія вялікія, што настаўнікі стамляліся іх чытаць. Больш прафесійная літаратурная дзейнасць пачалася ў 2008-2009 гадах, калі я прыйшла са сваімі вершамі ў «Маладосць». Трапіла ў рукі да прафесійных рэдактараў, якія мне паказалі, як усё павінна адбывацца. Гэта вельмі загартоўвае аўтара, развівае стыль, дапамагае працаваць над сабой.

— З тых часоў з Выдавецкім домам «Звязда» і сябруеце?

— Так. Друкавалася і ў «Алесі», і ў газеце «Звязда», і ў «Бярозцы», шмат чаго майго выходзіла ў часопісе «Маладосць». Аповесць «Зорка Ракхігархі» спачатку выйшла ў «Маладосці», а потым у фармаце кнігі — у выдавецтве «Звязда». Два гады таму Саюз пісьменнікаў прапанаваў паўдзельнічаць у «звяздоўскім» праекце і перакласці вершы сучасных рускіх паэтаў на беларускую мову. Мне дастаўся Аляксей Купракоў. Яго вершы ў маім перакладзе ўвайшлі ў зборнік «Сучасная руская паэзія».

— Алёна, вы і пісьменніца, і паэтэса, і сцэнарыст культурна-масавых мерапрыемстваў. У чым яшчэ хацелі б сябе паспрабаваць?

— У маёй скарбонцы ёсць два дыпломы конкурсаў «Беларусьфільма»: за сцэнарый мультфільма, прысвечаны нацыянальнай тэматыцы, — другое месца, і за сцэнарый стужкі ў конкурсе «Маладосць. Сям'я. Грамадства» — прэмія «Шанц». Было б цікава паспрабаваць сябе ў якасці кінасцэнарыста. Такога вопыту ў маёй практыцы раней не было.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

Новыя кнігі

ШТО АДБЫВАЕЦЦА З ЧАЛАВЕКАМ СЁННЯ?

Працягваецца выданне найноўшай у айчынным кнігавыданні серыі — «Сучасная беларуская літаратура». Выдавец — вядомае адукацыйнае выдавецтва «Аверсэв». Праект ажыццяўляецца пры падтрымцы Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Новая кніга, дзявятая па ліку, «Игла в квадрате» — зборнік прозы сучасных беларускіх літаратараў, якія пішуць на рускай мове: Алег Ждан-Пушкін, Сяргей Трахімёнак, Алесь Кажадуб (праўда, якраз ён піша і выдае кнігі і па-беларуску), Вера Зелянко, Анатоль Матвіенка, Валянціна Драбышэўская.

Па храналогіі падзей, у якіх удзельнічаюць героі апавяданняў, творы прывязаны да розных часін. Найбольш — да нашых дзён. Але тэматычна мастацкія вышукі згаданых аўтараў вельмі блізкія — пісьменнікі праяўляюць жаданне адказаць на пытанне, што адбываецца з чалавекам сёння, як ён рэагуе на рэчаіснасць, на зносіны з роднымі і блізкімі людзьмі, пра што ён думае, што яго ўзвышае, а што, наадварот, прызямляе.

Алег Аляксеевіч Ждан-Пушкін, які нарадзіўся ў 1938 годзе ў Смаленску, а дзяцінства і юнацтва правёў у Мсціслаўлі, на Магілёўшчыне, знаёміць чытача з апавяданнем «Вызваленне». Вось канцоўка твора, які вядзе чытача ў далёкі 1943 год (якраз у верасні 1943-га вызвалілі ад фашысцкай акупацыі Мсціслаў): «Сёння на тым месцы, дзе былі пажарышчы Максімкі і Евеля, стаіць шматкватэрны дом. У парку выраслі іншыя дрэвы. Брацкай магілы тут даўно няма: байцоў перапахавалі на старых гарадскіх могілках. Не плачце, маці, не плачце, сёстры, цяпер у вашых сыноў і братоў у гэтым горадзе свой вечны, аплаканы вамі, прытулак. Тое месца на зямлі, дзе ляжаў хлопец у белай кашулі з ярка-чырвонай плямай пад левай рукою і дзе Максімка ўпершыню пабачыў смерць, тысячу разоў абмытае дажджамі, і цяпер ужо ніхто не ведае, дзе і як гэта адбылося. На другім баку парку доўгі час дзейнічала танцавальная пляцоўка з духавым аркестрам, але і яна сышла ў мінулае. Сышлі людзі, якія тут, на плошчы, славілі перамогу і гаравалі. Але непакоіць жыхароў генетычная памяць: уяўляецца часам далёкі 43-і год, сонечны верасень, малады афіцэр з залатымі пагонамі: «Не плачце!..» А што ж было напачатку? З якімі пачуццямі, у якіх трывогах перажылі жыхары невялікага гарадка час вызвалення... Пра гэта — у творы Алега Ждана-Пушкіна «Вызваленне». Знаёмства з ваенным апавяданнем старэйшага беларускага празаіка падштурхоўвае да рэалізацыі і такой кніжнай ідэі: наспела патрэба выдаць класічныя і сучасныя беларускія апавяданні на тэму Вялікай Айчыннай вайны ў адной кнізе. Падаецца, што такога характару пераднанне будзе добрым мастацкім урокам выхавання для чытача розных пакаленняў, найперш — для нашай моладзі.

Сярод іншых твораў кнігі вылучаецца апавяданне «Игла в квадрате», якое і дало назву зборніку. Аўтар — Сяргей Трахімёнак. Пісьменнік расказвае гісторыю пра звычайную, але толькі на першы погляд, медыцынскую сястру, якая па-майстэрску робіць уколы, змену якой з надзвычайнымі спадзяваннямі чакаюць хворыя. Але, што ўласціва ўвогуле ўсёй прозе вядомага літаратара, аўтара многіх кніг, у жыццё вопытнай медсястры ўмешваюцца падзеі дэтэктыўнага характару. Напружанне, з якім утрымлівае Сяргей Трахімёнак увагу чытача, робіць і галоўнага героя, і сам твор рэльефнымі, дынамічнымі. Перад намі — гатовы сцэнарый кінафільма.

Інтрыга, псіхалагічнасць, шматаблічная вобразнасць — усё гэта прысутнічае і ў творах Алеся Кажадуба, Веры Зелянко, Анатоля Матвіенкі, Валянціны Драбышэўскай.

Нагадаем, што раней у серыі «Сучасная беларуская літаратура» выйшлі кнігі прозы «Дараванне», «Душа твая светлая», «Чароўная скарбніца», «Цені дзікага палявання» і іншыя. Набыць кнігі можна ў кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй краіне і ў кнігарні «Акадэмкніга» ў Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72.

Мікола БЕРЛЕЖ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
10 красавіка 2024 г. № 14 (747)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Надзённыя пытанні міждзяржаўнага і мясцовага значэння

вырашалі сенатары на мінулым працоўным тыдні

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец, а таксама член рабочай групы, галоўны саветнік аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Галіна Кулакоўская ўзялі ўдзел у пасяджэнні рабочай групы Міжпарламенцкай Асамблеі СНД праекта мадэльнага закона «Аб платформавай занятасці». Пасяджэнне прайшло ў Таўрычаскім палацы — штаб-кватэры Міжпарламенцкай Асамблеі СНД у Санкт-Пецярбургу.

Праект мадэльнага закона накіраваны на прававое рэгуляванне адносін, звязаных са з'яўленнем новай групы асоб — платформавых занятых, а таксама развіццём платформ занятасці. На пасяджэнні абмеркаваны ход работы над дакументам, адбыўся абмен думкамі па пытаннях падатковага абкладання, міграцыйных патокаў і адказнасці агентаў анлайн-платформ. Удзельнікі выказалі прапановы па ўдасканаленні дакумента, рэкамендавалі распрацоўшчыкам удзяліць асаблівую ўвагу аналізу краін СНД для вызначэння паняцця «самазаняты» і «платформавая занятасць».

* * *

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, намеснік генеральнага дырэктара (па камерцыйных пытаннях) СП ААТ «СПАРТАК» Аляксей Няверaў правёў прамую тэлефонную лінію і асабісты прыём грамадзян.

Да сенатара звярнуліся па пытаннях работы арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў Гомелі, стану дарог і дворавых тэрыторый, навядзення парадку на зямлі.

«Звязаныя з сістэмай ЖКГ, добраўпарадкаваннем горада звароты грамадзян часцей за ўсё ўдаецца вырашаць аператыўна, прыцягваючы кампетэнтных спецыялістаў, канкрэтных службовых асоб непасрэдна падчас прыёму або адразу пасля званка заяўніка. Бывае, на працягу некалькіх хвілін вырашаюцца нават самыя застарэлыя праблемы ў камунальнай сферы», — адзначыў Аляксей Няверaў.

Усе звароты і скаргі грамадзян узяты сенатарам на асабісты кантроль. Ва ўстаноўленыя тэрміны заяўнікі атрымаюць пісьмовыя тлумачэнні.

* * *

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа» Ала Смаляк узяла ўдзел у калегіі галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Гомельскага аблвыканкама.

На пасяджэнні абмеркавалі шэраг актуальных пытанняў, у тым ліку дэмаграфічную сітуацыю, правядзенне ў рэгіёне вакцынацыі супраць розных захворванняў, забеспячанасць кадрамі ўстаноў аховы здароўя.

Як адзначыла Ала Смаляк, пытанні аховы здароўя былі і застаюцца ў цэнтры пастаяннай увагі. «Напрыклад, толькі ў Гомельскай вобласці летась увялі ў эксплуатацыю тры рэнтгенаўскія камп'ютарныя тамографы — у Брагінскай, Жыткавіцкай, Рагачоўскай цэнтральных раённых бальніцах. Ужо сёлета такі кабінет адкрыўся ў Мазырскім анкалагічным дыспансеры. І работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы аховы здароўя праводзіцца паслядоўна і планамерна. Як і па абнаўленні аблічча ўстаноў аховы здароўя, іх мадэрнізацыі і ўдасканаленні», — падкрэсліла сенатар.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

Ігар КАРПЕНКА:

«ТРАДЫЦЫЙНА САВЕТ РЭСПУБЛІКІ АБ'ЯДНОЎВАЕ НАЙЛЕПШЫХ ПРАДСТАЎНІКОЎ З УСЁЙ КРАІНЫ»

ЦВК устанавіла вынікі выбараў у верхнюю палату парламента

Фота БелТА.

Фота Алены КРАВЕЦ.

Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала выбраных членаў Савета Рэспублікі восьмага склікання і ўстанавіла вынікі выбараў у верхнюю палату парламента. Такім чынам, працэс фарміравання Нацыянальнага сходу завершаны.

— Зыходзячы з інфармацыі членаў Цэнтральнай камісіі і дакументаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі, якія паступілі ў ЦВК, можна канстатаваць, што пасяджэнні Саветаў дэпутатаў прайшлі ў правамоцным саставе. Асаблівых меркаванняў членаў падліковых камісій, заяў іншых асоб аб парушэннях патрабаванняў кодэкса ў ходзе галасавання або падліку галасоў няма. У Савет Рэспублікі выбрана 56 членаў. Пры гэтым забяспечана пераемнасць: 15 членаў Савета Рэспублікі працавалі ў папярэдніх склікаННях, — адзначыў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка.

Пры гэтым ён нагадаў, што ў адпаведнасці з заканадаўствам Прэзідэнт краіны таксама мае права прызначыць восем сваіх прадстаўнікоў у склад Савета Рэспублікі.

— На падставе артыкула 107 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь Цэнтральная камісія ўстанаўлівае вынікі выбараў і рэгіструе выбраных членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, — сказаў Ігар Карпенка, заслухаўшы даклады членаў ЦВК па абласцях і Мінску.

У размове з журналістамі ён падкрэсліў, што члены ЦВК прысутнічалі на ўсіх пасяджэннях, і дакументы, якія былі прадстаўлены, і працэдуры, якія праходзілі на выбарах членаў Савета Рэспублікі, адпавядалі беларускаму заканадаўству.

Ігар Карпенка расказаў пра склад выбраных членаў Савета Рэспублікі. Што дастыцыцца гендэрнага прадстаўніцтва, то ў выбраным складзе Савета Рэспублікі восьмага склікання — 18 жанчын і 38 мужчын (у 2019 годзе было выбрана 14 жанчын і 42 мужчыны).

— Традыцыйна Савет Рэспублікі аб'ядноўвае найлепшых прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў краіны, людзей, якія не па чутках ведаюць жыццё і ўмеюць вырашаць пастаўленыя задачы, — адзначыў Ігар Карпенка.

Сярод выбраных 31 чалавек мае дзяржаўныя ўзнагароды, восем — вучоную ступень, вучонае званне. Акрамя таго, у Савет Рэспублікі ўвайшло па пяць старшынь мясцовых Саветаў дэпутатаў і органаў выканаўчай улады, шэсць кіраўнікоў устаноў аховы здароўя, пяць кіраўнікоў устаноў адукацыі. Таксама членамі верхняй палаты парламента выбрана 13 кіраўнікоў арганізацый прамысловасці, транспарту, па два прадстаўнікі сферы культуры, банкаўскай справы, сродкаў масавай інфармацыі, чатыры прадстаўнікі аграпрамысловага комплексу, два — ад грамадскіх арганізацый, адзін — ад Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і двое прафесіянальных ваенных. Партыйную прыналежнасць маюць 17 членаў Савета Рэспублікі (16 — члены Беларускай партыі «Белая Русь», адзін — член КПБ).

Па сутнасці, зацвярджэнне вынікаў выбараў у Савет Рэспублікі стала фінальным акордам адзінага дня галасавання, які ўпершыню прайшоў у нашай краіне.

— Такая форма (адзіны дзень галасавання) мае права быць. Безумоўна, ёсць нюансы, як і ў любой вялікай кампаніі, дзе задзейнічана шмат людзей і спрацоўвае чалавечы фактар. Але варта сказаць, што гэтыя выбары прайшлі даволі дынамічна. Так, нам трэба яшчэ зрабіць работу над памылкамі, паглядзець, што атрымалася, а што — не. Летам мы плануем правесці вялікі рэспубліканскі семінар з арганізатарамі выбараў, запрасіць людзей з месцаў, якія непасрэдна арганізоўвалі і забяспечвалі работу камісій. Правёўшы адзіны дзень галасавання 25 лютага, мы фактычна даём старт адзінаму дню галасавання, які пройдзе ў 2029 годзе, — падвёў вынікі старшыня ЦВК.

Першае пасяджэнне сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання прызначана на 12 красавіка.

— Раскачвацца няма часу. Цяпер ідзе працэс фарміравання Усебеларускага народнага сходу, завяршаюцца выбары ад шэрагу суб'ектаў, якія надзелены такімі паўнамоцтвамі. Рыхтуецца першае пасяджэнне УНС, працуе камітэт. Шчыльны графік, які мы ўстанавілі, прымушае нас працаваць аператыўна і вырашаць пастаўленыя пытанні, — патлумачыў Ігар Карпенка.

Ён выказаў меркаванне, што працэс выбрання дэлегатаў УНС ідзе дэмакратычна і галосна.

— Мы бачым шмат публікацый у прэсе — працэс праходзіць галосна. Суб'екты грамадзянскай супольнасці на сваіх з'ездах выбіраюць дэлегатаў УНС, ідуць выбары на сесіях абласных Саветаў дэпутатаў.

16 красавіка ЦВК правядзе выніковае пасяджэнне, дзе падвядзе вынікі выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Будуць запрошаны кіраўнікі структур грамадзянскай супольнасці, старшыні абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў.

Алена КРАВЕЦ.

СЯРОД 1200 дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу 290 чалавек павінны быць выбраныя ад мясцовых Саветаў. Дэпутаты Мінскага гарсавета становяцца дэлегатамі ў поўным сваім складзе — 60 чалавек, дэлегаты ад рэгіёнаў выбіраюцца на сесіях абласных Саветаў дэпутатаў. Такія сесіі ўжо адбыліся ўсюды, акрамя Магілёва — там дэлегатаў ад вобласці выбіраюць акурат сёння. Нашы карэспандэнты папрысутнічалі пры працэсе выбараў і пагаварылі з некаторымі прадстаўнікамі мясцовых Саветаў, каму даверылі прадстаўляць рэгіён у найвышэйшым органе народнай улады.

ДАВЕР,

ЛЮДЗІ ЗЯМЛІ І ПРАЦЫ

Прадстаўнікі АПК складаюць большую частку дэлегатаў УНС ад мясцовых Саветаў дэпутатаў Гродзенскай вобласці

Трэцяя сесія абласнога Савета вызначыла сваіх прадстаўнікоў на Усебеларускі народны сход. Шляхам тайнага галасавання выбраны 38 дэлегатаў. Палову галасоў атрымалі жанчыны. А вось па сферах дзейнасці ў самай масавай групе апынуліся работнікі аграпрамысловага комплекса рэгіёна.

Як зазначыла **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**, у вобласці актыўна прайшло абмеркаванне кандыдатур, вылучаных для ўдзелу ў народным форуме. Найлепшыя прадстаўнікі заходняга рэгіёна ўдастоены гонару стаць дэлегатамі сходу. Кожны з іх не толькі прафесіянал сваёй справы, але і валодае неабходнымі ведамі ў сацыяльным, палітычным жыцці і, што вельмі важна, мае жыццёвы вопыт і адданы сваёй Радзіме.

На Усебеларускім народным сходзе Гродзенскі рэгіён прадставяць 38 дэлегатаў — сем ад абласнога Савета дэпутатаў, 16 — ад раённых і гарадскіх Саветаў базавага ўзроўню і 15 — дэпутаты мясцовых Саветаў. Найбольшая колькасць — 9 чалавек — з'яўляюцца прадстаўнікамі АПК. Таксама ў ліку дэлегатаў — работнікі дзяржкіравання, прамысловасці, будаўніцтва, адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, іншых сфер дзейнасці. Прыкметна, што кандыдатуры мужчын і жанчын размеркаваны пароўну. Што датычыцца ўзроставай катэгорыі, яна даволі разнастайная. У складзе дэлегатаў рэгіёна ёсць і прадстаўнікі моладзі, і людзі са значным працоўным стажам і жыццёвым вопытам. Многія маюць высокія прафесійныя дасягненні.

Па словах Алены Пасюты, усе дэлегаты вядомыя і аўтарытэтныя людзі ў гарадах і раёнах. Сярод іх нямала і тых, хто мае вопыт работы ў дэпутацкім корпусе рознага ўзроўню. Старшыня абласнога Савета ўпэўнена, што гродзенцы разумеюць усю адказнасць, якая кладзецца на дэлегатаў УНС, і будуць дастойна прадстаўляць рэгіён на ўсебеларускім форуме.

Сярод тых, хто прадставіць дэлегацыю вобласці, — дэлегат ад мясцовых Саветаў, **дэпутат Сольскага сельскага Савета, кіраўнік вядомага на Гродзеншчыне сельгаспрадпрыемства «АграСолы» Вольга ЛУК'ЯНЕНКА**.

Сябе яна называе чалавекам зямлі і працы. І не ўтойвае таго факта, што калісьці пачынала сваю працоўную дзейнасць у родным калгасе простым кладаўшчыком. Але імкнулася наперад. І вось яна — ужо вучоны-аграном — бярэ ў свае рукі няпростую на той час гаспадарку.

— Дзякуючы дальнабачнай палітыцы дзяржавы сельская гаспадарка краіны зрабіла значны рывок. Я маю на ўвазе Дзяржаўную праграму адраджэння і развіцця вёскі ў 2005—2010 гадах. Гэта быў пачатак маёй працоўнай дзейнасці. Тады я зразумела, што ў сельскай гаспадаркі ёсць будучыня, — прыгадвае яна свае першыя крокі на пасадзе кіраўніка.

Больш як 20 гадоў стаіць яна каля руля гаспадаркі. За гэты час сітуацыя ў «АграСолы» істотна змяніліся. Рэалізацыя малака

павялічылася з 1,5 тоны ў суткі да 90 тон. Ураджайнасць павысілася да 65 ц/га. У мінулым годзе заработная плата склала 2423 рублі. Вольга Лук'яненка лічыць, што многае стала магчымым, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы — ільготнаму крэдытаванню, бюджэтнай дапамозе ў будаўніцтве малочнатаварных фермаў, будаўніцтве жылля, аднаўленні тэхнічнага парка.

На сёння жывёлагадоўчы статак сельгаспрадпрыемства дасягае амаль 10,5 тысячы галоў, летась сярэдні надой на карову склаў 9796 кілаграмаў малака. У гаспадарцы працуюць 280 чалавек. Прадпрыемства і яго работнікі неаднаразова атрымлівалі ўзнагароды на абласных «Дажынках». Вольга Іванаўна з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Смаргонскага раёна, была ўдастоена прэміі аблвыканкама «Чалавек года Гродзеншчыны». Сакрэт поспеху кіраўнік прадпрыемства бачыць у згуртаванай камандзе, у адказнасці кожнага і накіраванасці на добры вынік. Сваю пазіцыю яна імкнецца данесціць і як дэпутат сельскага Савета. На гэтай пасадзе яна амаль два дзесяцігоддзі.

— Цяпер я дакладна ведаю, калі будуць у нас, кажучы вобразна, хлеб і малако, тады будуць школы, клубы, бібліятэкі, будзе жыллё для маладых сем'яў. У сельскай мясцовасці, калі развіваецца сельская гаспадарка, развіваецца ўся тэрыторыя сельскага Савета: аб'екты паслуг, сферы харчавання, транспарт. Мяне вельмі радуе, што ў сельскую школу аграгарадка Солы апошнім часам прыходзяць не менш як дваццаць першакласнікаў. Усё гэта дзякуючы таму, што будуецца жыллё для маладых сем'яў, ствараюцца рабочыя месцы, людзі атрымліваюць дастойную зарплату, — зазначае кіраўнік-дэпутат.

Напрыклад, цяпер сельгаспрадпрыемствам выдзелены сродкі для будаўніцтва дома для сваіх супрацоўнікаў. Пасля рэканструкцыі малочнатаварнага комплексу для яго новых работнікаў патрабуецца жыллё. Вольгу Лук'яненка хвалюе тэма замацавання моладзі на вёсцы. У сваёй гаспадарцы яна многае робіць для гэтага і лічыць, што гэта пытанне заслугоўвае ўвагі на Усебеларускім народным сходзе.

— Сельскія працаўнікі ведаюць сапраўдную цану хлеба, ведаюць тыя каштоўнасці, што нам дадзены, — а гэта зямля, магчымасць працаваць на ёй і бачыць мірнае неба над галавой. Думаю, што сваёй працай і сваімі поспехамі мы захаваем усё тое, што нам дадзена, — выказала сваё меркаванне суразмоўца.

А яшчэ яна падзялілася сваёй мэтай. Вольга Іванаўна марыць аб тым, каб у найбліжэйшы час насельніцтва аграгарадка Солы дасягнула паўтары тысячы чалавек. Цяпер тут пражывае 1300 месцічаў. Яна лічыць, што гэта абавязкова спраўдзіцца. Пасля ўзвядзення новай фермы тут мяркуюць прыступіць да будаўніцтва новых дамоў. Каб аграгарадок рос і развіваўся.

— На Усебеларускім народным сходзе будзе прынята новая дзяржаўная праграма на будучую пяцігодку — гэта план нашых дзеянняў, новы штуршок у развіцці. Думаю, што нам па сілах ставіць амбіцыйныя задачы. Папярэдні перыяд развіцця паказаў, што мы гатовы да іх выканання, — запэўніла дэлегат УНС.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з архіва гераіні.

ГАТОВЫ ВЫРАШАЦЬ НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПЫТАННІ

Ад мясцовых Саветаў дэпутатаў Гомельшчыны абрана 55 дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Іх выбіралі шляхам адкрытага галасавання персанальна па кожнай кандыдатуры на пасяджэнні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў. Удзел у сесіі аблсавета ўзяў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ГОРЛАЎ.

Як нагадала **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ**, раней, на першай сесіі, было прынята рашэнне аб вызначэнні колькасці дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу, вылучаных ад мясцовых Саветаў дэпутатаў рэгіёна.

Так, ад Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў была ўстаноўлена норма прадстаўніцтва ў колькасці 11 дэлегатаў, ад раённых, Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў — 22 дэлегаты і столькі ж чалавек — ад Саветаў пярвічнага ўзроўню.

Фота БелТА.

— Выбранне дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў Гомельскай вобласці — адказная задача. Усебеларускі народны сход заўсёды адыгрываў важную ролю ў гісторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь. Згодна з яго новым канстытуцыйным статусам, гэта найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя краіны, які забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду, — падкрэсліла Кацярына Зенкевіч. — Кіраўнік дзяржавы неаднаразова адзначаў, што дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу павінны быць людзі, якія перажываюць за родную зямлю сэрцам і душой. Ад сябе дадам, што гэтыя людзі павінны быць гатовы вырашаць найважнейшыя пытанні далейшага развіцця нашай дзяржавы і, адпаведна, будуць несці адказнасць за лёс беларускага народа, — дадала кіраўнік дэпутацкага корпуса Гомельшчыны.

Па словах Кацярыны Зенкевіч, усе вылучаныя кандыдаты — людзі з вялікім вопытам работы, маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю, гатовы працаваць на карысць сваёй краіны і жыхароў свайго рэгіёна. Кандыдатура кожнага шырока абмяркоўвалася на пасяджэннях прэзідыумаў абласнога, гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў і на сесіях сельскіх Саветаў дэпутатаў. Вылучаныя дэлегаты — прадстаўнікі ўсіх сфер грамадства: кіраўнікі і работнікі прадпрыемстваў, устаноў адукацыі, аховы здароўя, культуры.

Сярод дэлегатаў ад Гомельшчыны — **дэпутат Хальчанскага сельскага Савета дэпутатаў Веткаўскага раёна Віталь ЖАЎТАНОГІН**.

— Вельмі ўдзячны свайму дэпутацкаму корпусу за тое, што аказалі мне такі высокі давер. Для мяне гэта ўпершыню. Разумею, што нам прыйдзецца вырашаць праблемы радавых грамадзян, якія мы не змаглі вырашыць на раённым, абласным узроўні, але будзем вырашаць на рэспубліканскім. Таксама падтрымліваць пазітыўныя рэгіянальныя ідэі, узнімаць шэраг праблем, якія, спадзяюся, будуць вырашаны, — падкрэсліў дэлегат Усебеларускага народнага сходу.

Дэпутат абласнога Савета, дырэктар ААТ «Гомельскі хімічны завод» Дзмітрый ЧАРНЯКОЎ у размове з журналістамі адзначыў, што яму выпаў гонар стаць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу ў трэці раз.

— Усе папярэднія гады мы працавалі над тым, каб у нас сапраўды быў створаны вось такі самы галоўны орган народаўладдзя. Тыя 1200 чалавек, якія будуць непасрэдна ўваходзіць у склад УНС, — гэта людзі, якія будуць прымаць сапраўды найважнейшыя рашэнні для нашай краіны. Ад гэтых рашэнняў залежыць, што з намі будзе заўтра, што чакае нашых дзяцей, што будзе з нашай дзяржавай. Гэта і бяспека, і эканоміка, і многія іншыя пытанні. Вядома ж, для мяне выбранне — гэта вельмі адказна. Спадзяюся, што і той досвед, назапашаны мною на пасадзе дырэктара прадпрыемства, і той багаж ведаў дазволяць мне зрабіць важкі ўклад у дзейнасць Усебеларускага народнага сходу, — расказаў Дзмітрый Чарнякоў.

Чачэрскі раён на Усебеларускім народным сходзе будзе прадстаўляць вядомы на Гомельшчыне і ў краіне ў цэлым кіраўнік сельгаспрадпрыемства — **дырэктар ААТ «Зорка» Чачэрскага раёна Галіна ТРЫБУНАХ**.

— Сапраўды шчаслівая, што стала дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. Для мяне гэта не ўпершыню, але ўсё ж такі тое, што зноў аказаны такі давер, — было неспадзявана. Гэта вельмі вялікая адказнасць. Прыкладу ўсе свае намаганні для агульнай справы, каб наша Радзіма квітнела, каб людзі жылі ў міры, каб дзеці нашы былі шчаслівыя, — падзялілася Галіна Трыбунах.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

І ГОНАР, І АДКАЗНАСЦЬ

З ЖЫЦЦЁВЫМ І ПРАФЕСІЙНЫМ ДОСВЕДАМ

Ад дэпутацкага корпуса Брэстчыны выбраны 52 дэлегаты УНС

На сесіі Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў у якасці дэлегатаў УНС выбралі 52 прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса. У адпаведнасці з квотай дзесяць кандыдатур вылучалася ад абласнога Савета, 21 — ад раённых і гарадскіх Саветаў і 21 — ад сельскіх. Удзельнікі сесіі падтрымалі вылучаных кандыдатаў і прагаласавалі за іх выбранне дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу.

Фота ZARYA.BY

У размове з журналістамі **старшыня Брэсцкага аблсавета Ігар БРЫЛЕВІЧ** адзначыў, што гэтыя людзі маюць падтрымку сваіх выбаршчыкаў, за іх грамадзяне аддалі свае галасы падчас адзінага дня галасавання: «Важна, што дэлегаты прадстаўляюць абсалютна ўсе галіны народнай гаспадаркі, валодаюць кампетэнцыямі і кваліфікацыямі, каб аб'ектыўна прымаць рашэнні найвышэйшага ўзроўню».

Абсалютная большасць дэлегатаў — людзі з вялікім жыццёвым досведам, прафесіяналы сваёй справы. Такія, напрыклад, як **Мікалай ШЫКАЛАЙ, старшыня вытворчага кааператыва «Моталь»** з Іванаўскага раёна, якога вылучылі ад сельскага Савета. Мікалай Сцяпанавіч — чалавек вядомы не толькі на сваёй малой радзіме, але і ў раёне, вобласці. Падчас прадстаўлення кандыдата па відэасувязі **старшыня Мотальскага сельвыканкама Этэры ПТАШЫЦ** сказала: «Мікалай Шыкалай прысвяціў жыццё роднаму Моталю, некалькі разоў выбіраўся дэпутатам раённага Савета, тры разы — абласнога, нязменны дэпутат сельскага Савета. Мікалай Сцяпанавіч удастоены звання «Найлепшы прадпрымальнік года» ў вобласці, адзначаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу краіны. Ён развівае прыватны бізнес і не застаецца ў баку ад жыцця вёскі, пастаянна выступае спонсарам сацыяльнай сферы раёна, падтрымлівае ініцыятывы па развіцці тэрыторыі. З яго ўдзелам і ўсебаковай падтрымкай праходзіць вядомы ва ўсёй краіне фестываль «Мотальскія прысмакі». І галоўнае, што ён хварэе душой за родныя мясціны».

«Для мяне самая высокая ўзнагарода — падтрымка маіх землякоў, — адзначае Мікалай Шыкалай. — Спадзяюся, што мой жыццёвы і вытворчы досвед будуць карысныя ў справе прыняцця важных рашэнняў. Гатовы адстойваць інтарэсы сельскіх тэрыторый і малых населеных пунктаў».

Людміла МАРОЗ, дырэктар Столінскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і ў сваёй асноўнай, і ў грамадскай — на пасадзе старшыні раённай арганізацыі БСЖ — і ў дэпутацкай дзейнасці адстойвае інтарэсы шматдзетных сем'яў, тым самым дбае пра дэмаграфічную бяспеку краіны. Людміла Васільеўна праблему ведае знутры, яна маці пяці сыноў. Дэлегат УНС лічыць, што пытанне дэмаграфічнай бяспекі павінна быць заўсёды на парадку дня вышэйшага органа народаўладдзя. «Буду прыкладваць усе намаганні для таго, каб шматдзетнасць у нашай краіне станавілася традыцыйнай, модная».

Начальнік Брэсцкай Чырванасцяжнай пагранічнай групы імя Ф. Э. Дзяржынскага Максім БУТРАНЕЦ, які быў вылучаны кандыдатам у дэлегаты ад Брэсцкага гарадскога Савета, перакананы, што тэма бяспекі, захавання суверэнітэту, стабільнага развіцця краіны стане адной з прыярытэтных для народнага веча. «Сёння важна фарміраваць пояс добрасуседства, але пры гэтым забяспечваць нацыянальныя інтарэсы на дзяржаўнай мяжы і ў памежжы», — падкрэсліў Максім Бутранец.

Прадстаўнік працуючай моладзі Пінскага раёна Уладзімір РАПІНЧУК мае намер узняць пытанне далейшай актывізацыі маладзёжнага руху. Уладзімір працуе намеснікам дырэктара Высокаўскай сярэдняй школы імя Дняпроўскай флатыліі. «Для мяне вялікі гонар прымаць удзел у распрацоўцы стратэгічных кірункаў развіцця грамадства, — сказаў дэлегат УНС. — З'яўляюся членам Маладзёжнага савета пры Цэнтральнай выбарчай камісіі. Маю намер выкарыстоўваць свой досвед у рабоце з моладдзю для выхавання актыўнай грамадзянскасці ў падрастаючага пакалення. Падзялюся напрацоўкамі нашай установы адукацыі».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«МЫ ВЕДАЕМ, ШТО ТРЭБА ЛЮДЗЯМ У РЭГІЁНАХ»

На пасяджэнні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 29-га склікання адбыліся выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў Мінскай вобласці.

Кандыдатамі ў дэлегаты УНС ад мясцовых Саветаў дэпутатаў былі вылучаны 60 чалавек: 12 чалавек ад Мінскага абласнога Савета дэпутатаў і 48 чалавек ад Саветаў дэпутатаў базавага і першаснага ўзроўняў. Падчас адкрытага галасавання дэпутаты Мінскага абласнога Савета дэпутатаў падтрымалі ўсе 60 кандыдатур.

Дэлегаты УНС ад Мінскай вобласці прадстаўляюць усе сферы эканомікі. Сярод іх — дзеячы культуры і мастацтва, урачы, настаўнікі, кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў і іншыя. Самаму маладому дэлегату ўсяго 24 гады. Гэта дэпутат Карына Лоўчая, якая працуе эканамістам у сельскай гаспадарцы. Яна прадставіць на народным вечы Лагойскі раён.

«Усебеларускі народны сход з'яўляецца канстытуцыйным органам, і вы на працягу пяці гадоў будзеце дэлегатамі УНС, прымаючы рашэнні па найважнейшых пытаннях, звязаных з развіццём нашай краіны. Таму хацеў бы вас прасіць, каб вы данеслі сваім калектывам тыя рашэнні, якія будуць прыняты, тую атмасферу, якая панавала на сходзе. Вы прадстаўляеце ўсе пласты, і, як кажа Прэзідэнт, УНС — гэта народнае веча, якое вызначае лёс нашай краіны. Гэта велізарны гонар і велізарная адказнасць. Калі мы ўсе разам будзем рухацца наперад, то любыя задачы і рашэнні нам будуць па плячы», — падкрэсліў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН**, які прысутнічаў на пасяджэнні аблсавета.

Пасля пасяджэння дэлегаты Усебеларускага народнага сходу падзяліліся тым, з якім настроем і з якімі задачамі яны адправяцца на народны форум.

«Місія адказная. На УНС я буду прадстаўляць сферу аховы здароўя, таму мяне хвалюе развіццё галіны, у прыватнасці якасць і даступнасць медыцынскай дапамогі насельніцтву. Таксама лічу, што дэлегат павінен быць актыўным патрыётам і паказваць актыўную пазіцыю грамадзяніна. Я з'яўляюся прадстаўніком Маладзёжнага савета, таму будуць праяўляць ініцыятыву яшчэ і ў гэтым плане. У Бярэзінскім раёне шмат робіцца для моладзі, але хацелася б больш актыўнага будаўніцтва жылля для маладых спецыялістаў з мэтай замацавання на рабочых месцах. Усё для таго, каб моладзь прыязджала і заставалася актыўнымі жыхарамі нашага раёна», — расказала **Крысціна КРУК, дэпутат Бярэзінскага раённага Савета дэпутатаў, галоўны ўрач Бярэзінскай ЦРБ**.

«Для мяне выбранне дэлегатам УНС — гэта вялікі давер дэпутатаў. На дэлегатаў ускладаецца вялікая адказнасць, бо УНС набыў новы статус пасля рэферэндуму і задач перад ім стаіць шмат. Гэта і зацвярджэнне ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, і ваенная дактрыны, і канцэпцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Паспрабую дух сходу несці ў масы і рэалізоўваць у сваёй паўсядзённай рабоце. Улічваючы мой досвед, я ведаю, што трэба людзям у рэгіёнах. Гэта і стварэнне новых рабочых месцаў, і павышэнне дабрабыту жыхароў, і прыцягненне інвестыцый. Усё гэта дазволіць вырашаць і сацыяльныя пытанні, і праблемы ЖКГ», — падзяліўся **Аляксандр КОНЧАНКА, дэпутат Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў, дырэктар Пухавіцкага доследнага эксперыментальнага завода**.

Паводле БелТА.

ПАТРЫЯТЫЗМ — РУХАВІК БУДУЧЫНІ

На трэцяй пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў выбралі 44 дэлегаты Усебеларускага народнага сходу ад мясцовых Саветаў дэпутатаў паўночнага рэгіёна.

У лік дэлегатаў увайшлі прадстаўнікі розных сфер — адукацыі, прамысловасці, аховы здароўя, прыватнага бізнесу, сацыяльнай сферы. «Гэтыя людзі досыць шырока вядомыя ў сваім прафесійным асяроддзі і рэгіёнах, валодаюць заслужаным аўтарытэтам, бо дасягнулі пэўных вынікаў у прафесійнай дзейнасці і пры гэтым валодаюць актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. Яны максімальна ўцягнутыя ў грамадскія працэсы ў сваіх населеных пунктах. Такі сплаў патрыятызму і прафесіяналізму, неабыякавасці да палітычных працэсаў у краіне, актыўнай грамадзянскай пазіцыі стаў ключавым фактарам, які паўплываў на рашэнне даверыць прадстаўляць менавіта гэтым дэлегатам інтарэсы шырокай грамадскасці Віцебскай вобласці», — адзначыў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ**.

Кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны падкрэсліў, што дэлегаты на УНС будуць сканцэнтраваныя не на мясцовых пытаннях, што датычацца дарог і ЖКГ, якія павінны вырашацца мясцовай уладай, а зоймуцца прапрацоўкай больш глабальных тэм. «УНС будзе з'яўляцца органам, які вызначае ключавыя кірункі як сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, так і пытанні міратворчасці, займацца ўмацаваннем нацыянальнай бяспекі».

На Усебеларускі народны сход ад паўночнага рэгіёна выбралі дзевяць дэлегатаў ад абласнога Савета дэпутатаў, 18 — ад базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, 17 — ад першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню.

У ліку тых, хто будзе прадстаўляць Віцебшчыну, — **настаўнік Лепельскай дзіцячай школы мастацтваў Аляксандр МІХНО**. Ён адзначыў, што разам з забеспячэннем пытанняў бяспекі важна звяртаць пільную ўвагу на патрыятычнае выхаванне моладзі. «Падзеі 2020 года паказалі, як важна не прамінаць гэтае пытанне, фарміраваць выразныя маральныя і грамадзянскія арыенціры ў душах дзяцей, каб ніхто не змог паўплываць на іх розумы і такім чынам знішчыць нашу краіну. У цяперашні час гэтаму пытанню аддаецца вялікая ўвага на самым высокім дзяржаўным узроўні. І зніжаць гэтую планку нельга. Мір — гэта падмурак будучыні нашых дзяцей, іх магчымасці ўпэўнена будаваць нашу краіну далей. Але і яны павінны расці патрыётамі, якія ўсведамляюць значнасць гэтага асноватворнага моманту для кожнага народа».

Старшыня Асвейскага сельскага Савета Верхнядзвінскага раёна Сяргей НАВІЦКІ таксама адзначыў, што жыхары Верхнядзвіншчыны, якая мяжуе з Латвіяй, як ніхто ў свеце сусветных падзей, усведамляюць каштоўнасць незалежнасці і спакою нашай краіны. Сяргей Уладзіміравіч нагадаў моманты жорсткіх гістарычных урокаў, якія не змаглі зламаць адзінства беларусаў. «Сёлета рашэннем Прэзідэнта Беларусі наш гарадскі пасёлак Асвея ўзнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Тады, падчас нямецкай карнай аперацыі «Зімовае чараўніцтва», якая закранула тэрыторыю некалькіх раёнаў, загінулі тысячы мірных жыхароў. Сотні населеных пунктаў фашысты спалілі, каб утварыць 40-кіламетровую паласу мёртвай зямлі. Нашы людзі памятаюць горкія старонкі гісторыі сваёй краіны і ўсімі сіламі заўсёды будуць імкнуцца захаваць за Беларуссю статус мірнай і стваральнай дзяржавы. Што б ні адбывалася навокал, мы спакойна жывём, будуем жыллё, гадуем дзяцей, добраўпарадкоўваем свае тэрыторыі, ходзім на работу. Усё гэта — каштоўнасць, якую ўсім нам трэба захаваць. Таму гэтаму пытанню я маю намер аддаць самую пільную ўвагу ў сваёй рабоце», — падкрэсліў дэлегат.

Дэлегаты паабяцалі, што, акрамя пытанняў патрыятычнага выхавання моладзі, на Усебеларускім народным сходзе будуць працаваць над паляпшэннем сістэмы адукацыі, аховы здароўя, прывіццём агульначалавечых і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, над развіццём прамысловага, культурнага і турыстычнага патэнцыялу краіны.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

ЛІНОЎСКІ ГАСЦІНЕЦ

Якасць жыцця вясковага жыхара залежыць таксама ад стану дарогі — пераканаць ў сельвыканкаме

Працуе ДРБУ-140.

Нездарма свята вёскі Лінова з нагоды яго 555-годдзя назвалі «Ліноўскі гасцінец». Мелі на ўвазе, вядома, і пачастунак, але ў першую чаргу дарогу, якая вядзе на свята. Побач з Ліновам — чыгуначная станцыя Аранчыцы, на якую прыбывалі многія з гасцей, а далей прасціраецца гасцінец, што вядзе ў цэнтр Лінова. Вось такі сімвалізм узялі за аснову пры распрацоўцы эмблемы свята і яго назвы.

Пра гэта карэспандэнту «МС» расказала **старшыня сельскага Савета Таццяна МАРДАНЬ**. «Фестываль правялі летась у жніўні, — працягвае Таццяна Мікалаеўна. — А назву рашылі захаваць. І ўсе наступныя святы вёскі таксама будзем называць «Ліноўскі гасцінец». А што датычыцца дарог, то нам сёння не соромна перад нашымі жыхарамі. Работа па паляпшэнні дарог вядзецца пастаянна. І за апошні год зроблена нямала».

З кіраўніком мясцовай улады едзем па вуліцах аграгарадка, дзе праведзены работы па абнаўленні дарожнага пакрыцця. У гэтым спісе вуліцы Дачная, Маладзёжная, Сонечная, дзе асфальт пракладзены цалкам. На вуліцах Вакзальнай, Паркавай і Шырокай абноўлены ўчасткі дарогі. Першымі рабілі Шырокую і Паркавую. Таццяна Мікалаеўна расказала пра цікавы выпадак на вуліцы Шырокай. Калі ўжо паклалі асфальт, з'ехала тэхніка, а кіраўнік мясцовай улады адной-чы прыпынілася, выйшла з машыны, каб палюбавацца вынікамі работы, насустрач ёй з дому выйшла жанчына. Як высветлілася, Вера Мікалаеўна Рэчыц 1940 года нараджэння добра памятае мінулае сваёй вёскі, нават апошнія гады вайны. Яна расказала многа цікавага, у тым ліку згадала, як гаравалі ад бездарожжа ў яе дзяцінстве. Мясцовасць нізінная, вясной і восенню людзі літаральна плавалі, дошкі падсцілалі, каб выйсці з двара. Паводле слоў сталай жанчыны, бывала, у школу не ішлі, бо не было як, калі поўныя боты вады набярэш, не выседзіш на занятках. Апошнія паўстагоддзя, вядома, дарогу даглядалі, яна была грунтовай, яе перыядычна падсыпалі, толькі летам цярпелі ад пылу. А вось цяпер дарога стала як сапраўдны гасцінец, толькі з гарадскім размахам, пракаментавала бабулька і дадала: «Вось бы мама мая ўстала і паглядзела, як прыгожа стала каля яе хаты». Сапраўды, вуліца Шырокая стала прывабнай у тым ліку і для навасёлаў.

Не так даўно маладая шматдзетная сям'я купіла дом, які пустуе. Дом непрыгодны для жылля, ён пойдзе пад знос, але новыя гаспадары набылі яго з-за ўчастка. У іх была магчымасць узяць участак у завулку Вакзальным, дзе цяпер будуюцца навасёлы, але яны аддалі перавагу гэтай мясціне. Найперш таму, што цэнтральная частка вёскі, побач школа і садок, Дом культуры, ну і новая дарога адыграла не апошнюю ролю.

Вуліца Сонечная пад веснавым сонцам выглядае ўрачыста, бо шырокая, з новым асфальтам. З абодвух бакоў вуліцы — дыхтоўныя дамы. Такія ж і іншыя вуліцы з абноўленым пакрыццём. Забудоўваецца завулак Вакзальны, там ужо падведзены інжынерныя камунікацыі. Калі жыллё будзе здадзена ў эксплуатацыю, чарга дойдзе і да дарогі. Цяпер вядзецца ўкладка асфальту на дарозе Аранчычы-Варотнае.

Літаральна нядаўна зроблена падсыпка ўчастка дарогі «Араб'і — Кутнявічы». Там штодня праходзіць школьны аўтобус. Дарога была зусім дрэннай — гэта мякка сказана. Асабліва пасля дажджу ў міжсезонне праехаць часам было вельмі няпроста. Жыхары абедзвюх вёсак гадамі наракалі на гэтую дарогу. Аб сваёй праблеме гаварылі выбаршчыкі і на сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Юрыем Наркевічам. Юрый Іосіфавіч палічыў гэта наказам выбаршчыкаў і таксама паспрыяў рамонту дарогі. Асфальт там не паклалі, але дарогу выраўнялі, адрамантавалі, падсыпалі гравіем. І цяпер праблемныя раней два з паловай кіламетры сталі цалкам прыдатныя для руху на любым транспарце, у чым мы са старшынёй сельвыканкама і пераканаліся, праехаўшы на легкавой машыне.

— На нашы дарогі грэх наракаць. У Лінове яны добрыя, — заўважыў **дэпутат Пружанскага раённага Савета, дырэктар мясцовага сельгаспрадпрыемства Васіль КАЗЬМЯРЧУК**. — Варта сказаць словы падзякі спецыялістам ДРБУ-140, якія правялі вялікую работу за мінулы год па асфальтаванні і паляпшэнні нашых вуліц ды і працягваюць падтрымліваць іх у належным стане. Як ні круці, дарогі — першая прыкмета якасці жыцця. Каб яны былі дрэнныя, людзі наўрад ці так актыўна будаваліся б у нашым аграгарадку, і цана на жыллё не трымалася б стабільна высокай. А калі будуюць, набываюць, значыць, жыць у нас камфортна.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
фота аўтара.

Пружанскі раён.

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

ПРЫРОДА АБ'ЯДНАЛА ТУРАЎЧАН

Фота Жытлавіцкай раённай газеты «Новае Палессе».

На Гомельшчыне адным з пераможцаў адкрытага конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў стаў праект актывістаў з Жытковіцкага раёна. Іх ідэя — правесці ў іх родным Тураве азеляненне і добраўпарадкаванне рэкрэацыйных зон урочышча П'явачнік. Справа ўжо зрушылася з месца. Жыхары аднаго з самых старажытных гарадоў Беларусі вельмі актыўна падтрымалі гэту грамадзянскую ініцыятыву.

З гонарам за землякоў расказвае аб тым, як у горадзе прыступілі да рэалізацыі праекта, **старшыня Тураўскага гарадскога Савета дэпутатаў Ігар МІЦЮРЫЧ**. Па словах Ігара Леанідавіча, ва ўрочышчы, што на ўскраіне горада каля новенькіх шматпавярховікаў, некалі было невялікае возера, аблюбаванае рыбакамі і мясцовай дзятвой. З часам возера змялела, зарасло вербалозам, практычна здзічэла.

— Даўно марылі добраўпарадкаваць гэты прыродны куток, каб было чыста і ўтульна, — падкрэслівае старшыня Тураўскага гарсавета.

Летась непадалёку ад урочышча быў узведзены шматпавярховы дом для работнікаў Тураўскага малочнага камбіната. Тарэц новенькага пяціпавярховіка ўпрыгожвае мурал з выявай Кірылы Тураўскага.

— Стала відавочна, тэрыторыя ўрочышча, што побач з домам, павінна таксама адпавядаць і быць добраўпарадкаванай, — тлумачыць Ігар Міцюрыч. — Яшчэ з мінулай восені звярнуліся па дапамогу да прадпрыемстваў і арганізацый горада, каб пачаць добраўпарадкаванне тэрыторыі. Жыхары дамоў, што побач з урочышчам, таксама вельмі актыўна адгукнуліся, прапанавалі сваю дапамогу ў ачыстцы тэрыторыі ад вербалозу. Узнікла ідэя ўдыхнуць жыццё ў стары П'явачнік і зрабіць каля возера гарадскую зону сямейнага адпачынку. Вырашылі прапанаваць праект азеляненне і добраўпарадкаванне рэкрэацыйных зон урочышча П'явачнік для ўдзелу у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў. Мы былі вельмі рады, калі даведаліся, што наш праект стаў адным з пераможцаў конкурсу.

Згодна з праектам, у выніку комплекснага добраўпарадкавання ўрочышча тут з'явіцца камфортная рэкрэацыйная зона з эколага-асветніцкім патэнцыялам. Будзе добраўпарадкавана больш чым два з паловай гектара тэрыторыі.

Фінансаванне грамадзянскай ініцыятывы прадугледжана на парытэтных пачатках. На рэканструкцыю ўрочышча П'явачнік неабходна 30 тысяч рублёў, 27 з якіх вылучана з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў, і тры тысячы (згодна з умовамі не менш за 10 %) сабралі жыхары горада.

Дарэчы, праект актыўна падтрымалі працоўныя калектывы, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, проста неабыякавыя жыхары Турава. Акрамя грашовай дапамогі, людзі прапанавалі паўдзельнічаць у ініцыятыве і фізічна. Цяпер, як толькі дазволіла надвор'е, на тэрыторыі правялі суботнік. Прыйшло папрацаваць сюды каля сарака чалавек: работнікі ўстаноў адукацыі і культуры, прадпрыемстваў і арганізацый горада, працаўнікі камунальнай службы. На прыбярэжнай паласе прыбіралі смецце, леташнюю траву і лісце, выразалі хмызняк.

— Мы не толькі выступаем з ініцыятывай, але і самі прыкладаем намаганні для развіцця кожнага, хто тут жыве, — падзяліўся **настаўнік сярэдняй школы № 1 Турава Уладзіслаў РАБІКАЎ**.

— Прыемна мець пад акном прыгожую зялёную зону. На суботнік з радасцю выйшлі ў свой выхадны, — расказалі **супрацоўнікі Тураўскага малочнага камбіната Сяргей і Вольга СТАМПКОЎСКІЯ**, якія ў мінулым годзе атрымалі кватэру ў новым доме якраз каля П'явачніка.

Папрацаваць на суботніку на ўрочышчы выйшаў і **настаўнік сярэдняй школы № 2 Турава Аляксей МАРОЗ**. Аляксей Уладзіміравіч перакананы, што так дарослыя асабістым укладам паказваюць дзецям прыклад актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

— Нашы дзеці ўжо цікавіліся, калі і ім можна будзе паўдзельнічаць у праекце, — расказаў настаўнік .

Пакуль актыўныя работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі ўрочышча стрымлівае высокі ўзровень грунтовых вод. Як толькі будзе магчыма, на аб'екце пачнецца паглыбленне дна вадаёма, будзе працаваць землярыйная тэхніка. На ўрочышчы давядзецца яшчэ выкарчаваць пустазелле — драўняна-хмызняковую расліннасць, умацаваць берагавую лінію.

— Далей на плане — добраўпарадкаванне пешаходных і веласіпедных дарожак, зон адпачынку, спартыўнага і дзіцячага гульнявога гарадкоў, стварэнне малых архітэктурных форм, клумбаў. Прадугледжаны сістэма дэкаратыўнага і функцыянальнага асвятлення, паркоўка, — дадаў старшыня Тураўскага гарасавета Ігар Міцюрыч. — Лічу, што конкурс грамадзянскіх ініцыятыў — магчымасць для жыхароў населеных пунктаў у партнёрстве з дзяржавай увасобіць у жыццё сацыяльна значныя праекты на карысць сваёй малой радзімы.

Дарэчы, як заўважыў Ігар Леанідавіч, тураўская прырода, здаецца, таксама адгукаецца на актыўнасць людзей на тэрыторыі ўрочышча. Ужо цяпер пасля добраўпарадкавання на вадаём прыляцелі вадаплаўныя птушкі. Тураў — вядомы пункт прыцягнення ўдзельнікаў акцыі па назіранні за птушкамі і папулярызацыі аднаго з самых займальных навуковых хобі — бёрдвотчынгу. Падчас сезонных міграцый у наваколлі старажытнага горада на адпачынак спыняюцца мільёны пералётных птушак, мноства з іх гняздуюцца тут. Таму добраўпарадкаваны стары П'явачнік, магчыма, стане новай любімай лакацыяй для бёрдвотчараў з розных куткоў краіны.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.766. **Нумар падпісаны ў 19.30 9 красавіка 2024 года.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

ДАРОГАМІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ

2024-ы — 110 гадоў з пачатку Першай сусветнай, Вялікай, як яшчэ яе называлі, вайны. І філакартычныя багацці, старыя паштоўкі, у тым ліку з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава, — велізарны збор сведчанняў, якія змянілі ўяўленні чалавецтва пра маштабы ахвяр, пра саму ваенную тэхніку, скіраваную несці ў грамадства смерць, жахі, страты, трагедыі...

Спярша маскоўскія, екацярынбургскія, петраградскія, краснадарскія, рыжскія выдавецтвы, а таксама Дамскія, Скобелеўскія, Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца камітэты тыражавалі паштоўкі з выявай самога манарха і галоўнага героя — імператара Мікалая II. А следам — карыкатуры на Вільгельма II і маляваныя мініяцюры казака Кузьмы Фірсавіча Кручкова, які стаў першым кавалерам Георгія ў вайне, уся праўда пра якую яшчэ была напярадзе. А тады, на пачатку драматычных падзей, партрэты Кручкова друкавалі на каробках папярос, запалак і цукерак. Подзвіг казака быў апісаны ў песні, пра Кузьму знялі фільм... Соф'я Фядорчанка, тады сястра міласэрнасці, яшчэ толькі рабіла першыя запісы для будучай кнігі «Народ на вайне», падслухоўваючы параненых па дарозе з Польшчы, Брэста да самага Гомеля. Мяняўся настрой, зразумелым станавіўся боль — асабісты, сардэчны, а таксама грамадскі, са спробай зразумець, што ж прынясе вайна заўтра, — мяняліся і тэмы паштовых мініяцюр.

А былі яшчэ і невядомыя паштоўкі, тыя фатаграфічныя звароты, якія стануць пазнавальнымі і зразумелымі шмат пазней, праз дзесяцігоддзі. На іх цяжка было знайсці пераможны выраз твару. Нават калі «карцінкі» гэтыя знаёмяць нас з ваякамі смелымі, усмешлівымі... Велізарны масіў такіх філакартычных памятак, шмат якія і сёння падаюцца сапраўднымі адкрыццямі гістарычнай праўды, у калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава прадстаўлены тэмай Першай сусветнай вайны. Частка паштовак — гэта ілюстрацыі вайны, створаныя салдатамі і афіцэрамі на другім баку фронту. У свой час Уладзімір Аляксеевіч і альбом нават асобны выдаў — з рэпрадукцыямі паштовак, якія былі адбіткам убачанага нямецкімі вайскоўцамі. Баюся памыліцца і не спрабую адгадваць, якімі вачыма ўбачылі вайну яны, учарашнія сяляне, рабочыя, настаўнікі, гандляры, рамеснікі, вучоныя і, відаць, пісьменнікі, мастацтвазнаўцы, і, вядома ж, прафесіянальныя вайскоўцы, уцягнутыя сваімі правадырамі ў бездань, у вір трагедыі... Але вось усвядомлена сцвярджаю, што свету і гісторыі яны пакінулі сведчанні, якія ні на кроплю не адрозніваюцца ад памятак, зробленых па другі бок акопаў.

...Кобрын. Яшчэ толькі сышоў з гэтых мясцін палявы санітарны атрад, у якім нёс службу Канстанцін Паўстоўскі, будучы класік рускай савецкай літаратуры. А немцы паспяваюць занатаваць Рыначную плошчу, руіны па Брэсцкай вуліцы, мост праз Мухавец. І два здымкі распавядаюць пра санітарны батальён і шпіталь, які размясціўся ў Кобрыне.

Многія здымкі носяць альбомны характар, сам факт іх з'яўлення ў гісторыі звязаны з традыцыйнай весялосцю ад атрыманых трафеяў, жаданнем паказаць сябе ўдалымі і разбітнымі ваякамі. Зусім як па Швейку: «Мы — солдаты-молодцы, // Любят нас красавицы...» Як у Гродне ў 1915 годзе... Добрае аддзяленне нямецкіх салдат узбілася на платформу трафейнай рускай «бамбардзіры». Палова з іх забралася на самы верх ствала гарматы. Шчаслівыя, відаць, таму, што пакуль што не трапілі пад асколачны снарад такой сур'ёзнай зброі.

Час захаваў і здымак рускага снарада, які не разарваўся. Адправіўшы да варожых пазіцый каля берагоў Нарачы смертаносны груз, рускія бамбардзіры спадзяваліся, што «падарунак» дасягне мэты. Але вось не разарваўся і захаваў, мяркуючы па яго дыяметры, многія і многія жыцці. Наўрад ці насмешлівыя нямецкія салдаты, якія асядлалі рускую гармату ў Гродне, маглі ведаць, што ў Першую сусветную Расія ўвайшла з запасам артылерыйскіх боезапасаў усяго толькі на некалькі лічаных месяцаў. Майстры ладзіць прагнозы планавалі, што вайна запатрабуе ніяк не больш чым пяць з паловай мільёнаў артылерыйскіх снарадаў. Прыблізна гэтулькі і было ў Расійскай імперыі. А толькі штомесячная (!) запатрабаванасць у снарадах ужо ў 1915 годзе складала тры мільёны... Ваенная прамысловасць не стаяла на месцы. Вядома ж, не толькі ў Расійскай імперыі. Хоць і скардзіўся сваёй каханай у лірычным лісце адмірал Калчак: «Падводная лодка і аэрапланы псуюць усю паэзію вайны. Страляць даводзіцца ў нешта нябачнае, такая ж нябачная падводная лодка пры першай жа памылцы ўзарве карабель, сама зачастую не ведаючы і не разгледзеўшы рэзультатаў; лятае нейкая гадзіна, у якую амаль немагчыма патрапіць. Нічога для душы няма...» Немцы ж сур'ёзна «апаэтызавалі» артылерыю, стварыўшы на канцэрне Крупа легендарную «Вялікую Берту», якая магла адпраўляць снарад у 900 кілаграмаў (!) на адлегласць да 14 кіламетраў. Асколкі ад «Берты» складалі да 15 тысяч кавалкаў металу. Не выратоўвала ад бранябойных снарадаў нават сцяна са сталі і бетону двухмятровай таўшчыні. Таму крэпасці ў Першую сусветную згубілі сваё заўсёднае абарончае прызначэнне. Праўда, калі ўважліва аглядаць тэатр ваенных дзеянняў Першай сусветнай на тэрыторыі Беларусі, сваю ролю адыграла яшчэ і кавалерыя. Чытаем у справаздачы, напісанай амаль праз чвэрць стагоддзя пасля вайны: «...Поспех германцаў у Віленска-Маладзечанскай аперацыі трэба цалкам аднесці да заслуг 6-га коннага корпуса генерала Гарнье. На працягу ўсёй аперацыі гэты корпус, які ўварваўся ў тыл, а затым і ў аператыўную глыбіню рускага Заходняга фронта, вёў за сабою ўдарную групоўку 10-й Германскай арміі...»

Здымкі, якія засталіся ў ваенным крыніцазнаўстве дзякуючы нямецкім салдатам і афіцэрам, расказваюць пра Беларусь не толькі ваенную, напоўненую ўсім драматызмам разбурэнняў і знішчэнняў. Чужаземных нявольнікаў вялікай мілітарысцкай палітыкі прыцягвалі невядомыя дагэтуль гістарычныя, архітэктурныя ландшафты. Фатографам былі цікавыя людзі, чый побыт нечым адрозніваўся ад знаёмага ім нямецкага, рускага жыцця. І глядзіш: усміхаюцца на паштоўках, аддрукаваных у нямецкіх друкарнях, нашы з вамі прашчуры. Часам, відаць, і горка ўсміхаецца пакаленне, якое выпрабавала на сабе чарговую драматычную трагедыю... Усміхаюцца перад аб'ектывам нямецкага салдата людзі, якія яшчэ і не ведалі, не ўяўлялі напоўніцу, што напярадзе іх чакаюць новыя выпрабаванні, новыя палітычныя і сацыяльныя, грамадскія разломы. А яны і крыві прынясуць не менш, чым Першая суветная...

Уладзімір Ліхадзедаў, чые збіральніцкія памкненні ўражваюць, выдаў нямала філакартычных альбомаў, асновай для якіх сталі старыя паштоўкі, што калекцыянер вышукваў літаральна па ўсім свеце. І Першая сусветная — багаты «персанаж» на старонках гэтых выданняў...

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Магілёў. Агульны выгляд, 1918 год.

Кобрын. Рынкавая плошча, 1916 год.

Гродна. Трафейная руская гармата, 1915 год.

Нарач. Неразарваны рускі снарад, 1916 год.

Слонім, 1916 год.

Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

www.bsb.by

Форма 1

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
за 31 марта 2024 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	31 марта 2024 г.	1 января 2024 г.
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101		157 635	211 225
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		5 465	5 043
4	Средства в Национальном банке	1103		263 374	203 790
5	Средства в банках	1104		306 529	322 992
6	Ценные бумаги	1105		117 000	114 206
7	Кредиты клиентам	1106		54 926	48 303
8	Производные финансовые активы	1107		150	7
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		35	35
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		57 109	56 067
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		-	-
13	Отложенные налоговые активы	1112		0	-
14	Прочие активы	1113		23 162	32 124
15	ИТОГО активы	11		985 385	993 792
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
17	Средства Национального банка	1201		40	40
18	Средства банков	1202		214	671
19	Средства клиентов	1203		837 289	848 596
20	Ценные бумаги банка	1204		-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205		397	263
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		232	232
23	Прочие обязательства	1207		7 482	12 804
24	ВСЕГО обязательства	120		845 654	862 606
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211		22 900	22 900
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		17 277	17 276
29	Фонды переоценки статей баланса	1214		38 629	41 076
30	Накопленная прибыль	1215		60 925	49 934
31	ВСЕГО собственный капитал	121		139 731	131 186
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		985 385	993 792

Форма 2

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за 31 марта 2024 года

Закрытое акционерное общество
«Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	31 марта 2024 г.	31 марта 2023 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		5 844	4 300
2	Процентные расходы	2012		499	333
3	Чистые процентные доходы	201		5 345	3 967
4	Комиссионные доходы	2021		18 859	11 460
5	Комиссионные расходы	2022		8 367	4 846
6	Чистые комиссионные доходы	202		10 492	6 614
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		438	548
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(243)	133
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		15 841	15 437
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		9	(430)
11	Чистые отчисления в резервы	207		1 820	2 887
12	Прочие доходы	208		390	566
13	Операционные расходы	209		13 521	11 261
14	Прочие расходы	210		2 633	630
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		14 298	12 057
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		3 327	2 611
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		10 971	9 446

Председатель Правления Дубков С.В.

Главный бухгалтер Бельник А.Н.

Дата подписания: 5 апреля 2024 г.

УНП 807000069

Годовой отчет эмитента ценных бумаг за 2023 год

ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»

Адрес: 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, тел./факс 34 07 65, УНП 400078768

4. Доля государства в уставном фонде эмитента – 0 (всего в процентах), в том числе:

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
Республиканская	-	-
Коммунальная всего	-	-
в том числе		
областная	-	-
районная	-	-
городская	-	-

5. Количество акционеров – всего 211 лиц
в том числе: юридических лиц – 5, из них: нерезидентов Республики Беларусь – 0,
физических лиц – 206, из них: нерезидентов Республики Беларусь – 4.

6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	На отчетную дату	На аналогичную дату прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	1576	1447
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тысяч рублей	1540	1426
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	4,27	3,92
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги)			
типа _____	рублей	0	0
типа _____	рублей	0	0
Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	4,17	3,86
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги)			
типа _____	рублей	0	0
типа _____	рублей	0	0
Период, за который выплачивались дивиденды	первый квартал, полугодие, девять месяцев, год	2022 год, первый кв. 2023, полугодие 2023, девять месяцев 2023	x
Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов	число, месяц, год	23.03.2023, 12.05.2023, 28.07.2023, 24.10.2023	x
Срок (сроки) выплаты дивидендов	число, месяц, год	24.03.2023–31.12.2023, 12.05.2023–31.12.2023, 31.07.2023–31.12.2023, 26.10.2023–31.12.2023	x
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	89	79
Количество акций, находящихся на балансе общества, всего	штук	0	0

в том числе: поступившие в распоряжение общества

дата зачисления акций на счет «депо» общества	количество акций штук	срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества
-	-	-

приобретенные в целях сокращения общего количества акций

дата зачисления акций на счет «депо» общества	количество акций штук	x
-	-	x

7. Отдельные показатели деятельности открытого акционерного общества:

Наименование показателя	Единица измерения	На отчетную дату	На аналогичную дату прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	50548	47082
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	тысяч рублей	44072	41402
Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода)	тысяч рублей	5277	4805
В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	6476	5680
прочие доходы и расходы по текущей деятельности	тысяч рублей	-1384	-1226
прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	тысяч рублей	185	351
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	тысяч рублей	1154	933
Чистая прибыль (убыток)	тысяч рублей	4123	3872
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тысяч рублей	20916	18361
Долгосрочная дебиторская задолженность	тысяч рублей	0	0
Долгосрочные обязательства	тысяч рублей	0	0

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2023 год: 26.03.2024 г.
Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности подготовлено 01.03.2024 г.
Аудит проведен:
Аудиторская организация: Общество с ограниченной ответственностью «Юнион-Аудит».
Местонахождение: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Клары Цеткин, 18, оф. 5.
Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано решением Минского горисполкома от 31.05.2017 г., свидетельство о государственной регистрации № 0138451 выдано 31.05.2017 г. Регистрационный номер аудиторской организации в реестре 10009. Учетный номер плательщика: 192922380.
Период, за который проводился аудит: 01.01.2023–31.12.2023.
Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности - сведения о данных нарушениях:
Мы провели аудит бухгалтерской отчетности Открытого акционерного общества «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» (246008, Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Лещинская, 49), состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2023 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.
По нашему мнению, прилагаемая бухгалтерская отчетность Открытого акционерного общества «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Открытого акционерного общества «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» на 31 декабря 2023 г., финансовые результаты ее деятельности и изменение его финансового положения; в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: Единый информационный ресурс рынка ценных бумаг (ЕПФР) 03.04.2024.
13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): применяется Регламент работы с реестром акционеров, Положение об аффилированных лицах, Положение о дирекции, Положение о ревизионной комиссии, Положение о счетной комиссии.
14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет – www.progres.gomel.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению **Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества**
(продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА № 34

с инв. 620/С-44674 общей площадью 192,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622828131010000256, площадью 0,0614 га
(право постоянного пользования, водоохранная зона р. Перепутъ на пл. 0,0614 га)
по адресу: Минская область, Дзержинский район, Негорельский с/с, п. Энергетиков, ул. Дзержинского, 3А.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 66 149,10** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **6 614,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **15.05.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.05.2024** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: (801716) 6-49-33; (8029) 578-35-46.

УНП 600037767

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Государственным предприятием

«БелЮрОбеспечение» (192821149)

назначено проведение электронных торгов:

Организатор	Торговое открытое акционерное общество «Гродно Культторг»
Предмет	Лот № 9.2024.04.00050, комплекс недвижимого имущества в г. Гродно
Место нахождения	г. Гродно, ул. Соколовского, 20К
Начальная стоимость	812 081,30 белорусских рублей с НДС

Торги будут проведены 25.04.2024 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.
Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 24.04.2024.
Подробная информация размещена на сайте **e-auction.by** в разделе «Аукционы».

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Государственным предприятием

«БелЮрОбеспечение» (192821149)

назначено проведение электронных торгов:

Организатор	Торговое открытое акционерное общество «Гродно Культторг»
Предмет	Лот № 9.2024.04.00051, комплекс недвижимого имущества в г. Гродно
Место нахождения	г. Гродно, ул. Соколовского, 20
Начальная стоимость	1 159 150,12 белорусских рублей с НДС

Торги будут проведены 25.04.2024 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.
Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 24.04.2024.
Подробная информация размещена на сайте **e-auction.by** в разделе «Аукционы».

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:

В извещение о проведении электронных торгов (24.04.2024) по продаже **производственной базы**, расположенной по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Заводская, д. 29, принадлежащей ОАО «Борисовдрев», опубликованном в газете «Звязда» от 23.03.2024, вносится изменение: **условия аукциона читать как:** покупатель обязан заключить договор купли-продажи на имущество в количестве 8 единиц общей стоимостью (с НДС) 78 141,08 бел. руб., числящееся на балансе продавца (подробнее на www.ipmtorgi.by). В случае отказа покупателя от подписания данного договора купли-продажи продавец вправе отказаться от заключения договора на продажу производственной базы в любой момент, в том числе и после проведения аукциона.

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06, auction@cpo.by.

УНП 600012256

В суд Волковысского района поступило заявление об объявлении умершей СЕЛИНОЙ Марины Романовны, 16 апреля 1969 года рождения, уроженки г. Волковыска Гродненской обл., последнее известное место жительства которой: Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Садовая, 39, которая 28 декабря 1990 г. направлялась из г. Могилёва в г. Волковыск Гродненской обл., и до настоящего времени её место нахождения не известно.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Селиной Марине Романовне, сообщить их суду Волковысского района в течение двух месяцев с момента публикации.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Будзьце пільныя

ПРЫСМАКТАЎСЯ, ПАРАЗІТ!

Распачаўся сезон актыўнасці кляшчоў

У сувязі з пацяпленнем клімату перыяд актыўнасці кляшчоў у нашай краіне падоўжыўся. Ужо сёлета каля 200 беларусаў звярнулася па медыцынскую дапамогу пасля прысмоктвання гэтых павукападобных. За мінулы год такіх зваротаў было каля 31 тысячы. Дзе найчасцей нападаюць на чалавека гэтыя крывасмокі? Як паводзіць сябе, каб клешч не праявіў да вас цікавасці, і што рабіць, калі ён усё ж такі прысмактаўся? Які прэпарат рэкамендуецца прымаць у такім выпадку? Чаму няма сэнсу даследаваць на інфекцыі самога кляшча? Пра гэта расказалі медыкі.

Больш рызыкуюць жыхары Брэстчыны і Гродзеншчыны

Кляшчовыя інфекцыі ў Беларусі рэгіструюцца штогод. У сувязі з пацяпленнем арэал эксодавых кляшчоў імкліва прасоўваецца на поўнач, расце іх колькасць, павялічваецца працягласць перыяду актыўнасці. У цяперашні час кляшчы актыўныя 10 месяцаў — з лютага па лістапад. Таму з канца зімы да позняй восені не выключана магчымасць заражэння кляшчовымі інфекцыямі.

— Па даных беларускіх вучоных, кляшчы з'яўляюцца пераносчыкамі ўзбуджальнікаў дзевяці інфекцый. Але штогод у нас рэгіструецца толькі два захворванні — Лайм-барэліёз і кляшчовы вірусны энцэфаліт. Штогод у краіне ў сярэднім рэгіструецца больш чым дзве тысячы выпадкаў хваробы Лайма і больш двухсот выпадкаў кляшчовага энцэфаліту, — паведаміла **энтамолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана ЯШКОВА.**

Захваральнасць на Лайм-барэліёз рэгіструецца амаль па ўсёй краіне і размяркоўваецца з большай доляй па Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. А вось на кляшчовы энцэфаліт найчасцей хварэюць у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — на іх долю прыпадае каля 62 % усіх выпадкаў гэтай інфекцыі.

У лесе, на дачы, у зонах адпачынку

Узбуджальнікі кляшчовых інфекцый перадаюцца чалавеку праз прысмоктванне кляшчоў. Заразіцца кляшчовым энцэфалітам можна таксама і пры ўжыванні сырога малака коз, у якіх у перыяд масавага нападзення кляшчоў вірус можа знаходзіцца ў малацэ. Успрымальнасць да кляшчовых інфекцый дастаткова высокая і не залежыць ад полу і ўзросту, хварэюць і дарослыя, і дзеці.

У 2023 годзе было зарэгістравана больш як 31 тысяча зваротаў да медыкаў з нагоды прысмоктвання кляшчоў (на 11 % больш у параўнанні з 2022 годам). Перавышэнне краінавага паказчыка пацярпелых ад кляшчоў на 100 тысяч насельніцтва адзначалася ў Магілёўскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцях.

— Па меркаваных месцах нападзення кляшчоў устаноўлена, што прысмоктванне адбываецца звычайна ў лясных масівах (44 % ад усіх выпадкаў), на другім месцы — сельская мясцовасць і дачныя ўчасткі (35 %), на долю тэрыторый населеных пунктаў і зон адпачынку прыпадае 12 %, — прывяла лічбы Святлана Яшкова.

Як абараніцца?

Энтамолаг адзначыла, што адным з самых эфектыўных метадаў барацьбы з эксодавымі кляшчамі з'яўляецца прымяненне акарыцыдных прэпаратаў для апрацоўкі тэрыторый. У 2023 годзе яны праведзены на плошчы больш чым дзве тысячы гектараў (на 5 % больш, чым годам раней).

Абарона ад заражэння кляшчовымі інфекцыямі ў многім залежыць і ад самога чалавека. Падчас наведвання лясных і паркавых зон рэкамендуецца выконваць наступныя правілы. Пры працяглым знаходжанні ў лесе варта насіць спецыяльнае адзенне, якое максімальна закрывае цела. Абавязковы галаўны ўбор. Важна выкарыстоўваць адпужвальныя сродкі — рэпеленты — ці рэпелентна-акарыцыдныя сродкі. Апошнія не толькі адпужваюць кляшчоў, пры кантакце з імі крывасмокі гінуць. Праз кожную гадзіну ў лесе ці парку трэба аглядаць адзенне і цела, каб выявіць кляшчоў. У ежу варта ўжываць толькі кіпячонае казінае малако — вірус гіне ўжо праз 2-3 хвіліны кіпячэння.

На прысядзібных участках, на дачах рэкамендуецца праводзіць добраўпарадкаванне тэрыторый: прыбіраць буралом, вырубаць непатрэбнае кустоўе, скошваць траву.

Выдаляем крывасмока правільна

Калі клешч прысмактаўся, варта яго правільна выдаліць. Для гэтага лепей на магчымасці звярнуцца ў арганізацыю аховы здароўя. У адваротным выпадку паспрабаваць зрабіць гэта самастойна.

— Рэкамендуецца тры спосабы самастойнага выдалення: з дапамогай пінцэта, баваўнянай ніткі ці спецыялізаваных сродкаў, якія прадаюцца ў аптэках. Пасля выдалення варта апрацаваць месца любым спіртаўтрымальным растворам. Па вяртанні дадому трэба абавязкова звярнуцца ў арганізацыю аховы здароўя да тэрапеўта ці педыятра, дзе прызначаць лячэнне і ўстановяць назіранне, — параіла Святлана Яшкова.

Па жаданні можна даследаваць эксодавых кляшчоў, але гэта неабавязковая працэдура і выконваецца яна на платнай аснове. Бясплатна праводзяцца даследаванні кляшчоў толькі ў тых асоб, у якіх маюцца супрацьпаказанні да прымянення антыбіётыку, што выкарыстоўваецца для прафілактычнага лячэння.

Таксама абараніцца ад кляшчовага энцэфаліту можна з дапамогай прышчэпкі. Вакцына супраць Лайм-барэліёзу ў свеце не распрацавана. Па кансультацыю па атрыманні прышчэпак варта звярнацца ў паліклініку па месцы жыхарства. У Беларусі зарэгістравана тры вакцыны: расійскія «Энцэвір» і «Клешч-э-вак» і амерыканская «ЦікаВак Джуніор».

Чым небяспечныя кляшчовыя інфекцыі?

Традыцыйна пікі захваральнасці на кляшчовыя інфекцыі прыпадаюць на май і верасень, паведаміў **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай часці Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы, галоўны пазаштатны інфекцыяніст камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Святаслаў ВЕЛЬГІН.** Інкубацыйны перыяд працягваецца ад некалькіх дзён да трох-чатырох тыдняў, пасля чаго ўзнікае характэрная сімптаматыка.

— Хвароба Лайма сустракаецца прыкладна ў дзесяць разоў часцей, чым кляшчовы энцэфаліт, і яе асноўная прыкмета — мігруруючая эрытэма. У месцы прысмоктвання кляшча ўзнікае плямка як пры ўкусе камара. Праз некалькі дзён вакол яе з'яўляецца пачырваненне. З цягам часу, звычайна праз некалькі дзён, яно павялічваецца ў памерах, набываючы форму кальца. Гэта тыповая кольцападобная эрытэма, якая распаўсюджваецца, — апісвае праявы інфекцыяніст.

Пры гэтым Лайм-барэліёз — захворванне не надта небяспечнае і праходзіць, як правіла, нават без лячэння. Але медыкі ўсё ж рэкамендуюць праводзіць тэрапію, бо ў некаторых людзей могуць узнікаць адтэрміноваными праявы захворвання, прагрэсіраванне да другой і трэцяй стадый.

— На першай стадыі бываюць рэдкія выпадкі, калі эрытэма не ўзнікае, але з'яўляецца востая ліхаманка. І, як правіла, недалёка ад месца прысмоктвання кляшча запаляецца лімфатычны вузел. Стан суправаджаецца павышанай тэмпературай і агульным інфекцыйным сіндромам як пры грыпе — баляць мышцы, суставы, з'яўляюцца галаўны боль і недамаганне. Гэта сведчыць, што ў вас беззрытэмная форма хваробы Лайма ці энцэфаліт, які, як вядома, развіваецца без эрытэмы, — тлумачыць урач.

З'яўленне гэтых сімптомаў — нагода звярнуцца да ўрача, які прызначыць аналізы. Яны неабходны для выключэння кляшчовага энцэфаліту.

— У адным кляшчы можа быць некалькі ўзбуджальнікаў. Тактыка папярэджання гэтых інфекцый аднолькавая. Калі ўзнікла прысмоктванне, то ў першыя двое-трое сутак важна правесці антыбіётыкапрафілактыку. Дзецям пасля васьмі гадоў і дарослым прызначаецца даксіцыклін — безрэцэптурны антыбіётык у дазіроўцы 200 мг. Трэба прыняць дзве капсулы ці дзве таблеткі аднаразова пасля ежы. Гэта дазваляе знізіць рызыкі заражэння Лайм-барэліёзам больш чым у дзесяць разоў, — кажа Святаслаў Вельгін.

Пры гэтым нават прысмоктванне інфікаванага кляшча не гарантуе, што вы захварэеце, бо можа спрацаваць імунітэт ці не хапіць часу для перадачы інфекцыі. Калі на працягу месяца пасля прысмоктвання ніякіх сімптомаў вы не заўважылі, значыць, вы не захварэлі і ніякіх аналізаў здаваць не трэба. Мае сэнс рабіць гэта толькі тады, калі ёсць клінічная сімптаматыка і іх прызначыў урач для ўдакладнення дыягназу.

Другая стадыя Лайм-барэліёзу можа развівацца прыкладна ў 10 % людзей. Пры гэтым пакутуе адна з трох сістэм: скура (з'яўляюцца другасныя эрытэмы на аддаленых ад месца ўкусу частках цела, якія праз некалькі дзён праходзяць), апорна-рухальны апарат (узнікаюць артрыты буйных суставаў з болевым сіндромам), нервовая сістэма — як перыферычная (неўрыты, радзікуліты), так і цэнтральная (менінгіты і менінгаэнцэфаліты).

Трэцюю стадыю часам называюць хранічным барэліёзам, але больш правільна лічыць яго познім. Калі пацыент на працягу дзвюх першых стадый не звяртаўся да ўрача, то могуць узнікаць аддаленыя наступствы ў выглядзе артрытаў, менінгаэнцэфалітаў, полінеўрытаў.

— Мінулы год быў дастаткова актыўны па клешчавым энцэфаліце, мы мелі справу з цяжкімі формамі. Аднак прагноз па гэтай інфекцыі ў нашай краіне спрыяльны ў адрозненні ад сітуацыі на Дальнім Усходзе і ў Сібіры. Праўда, і да нас даходзяць паралітычныя формы, калі развіваецца слабасць у канечнасцях аж да страты прытомнасці, пацыенты часам бяруцца на штучную вентыляцыю лёгкіх аж да лятальных зыходаў, якія, на шчасце, у нас вельмі рэдкія, — адзначыў Святаслаў Вельгін.

Таму, па меркаванні медыкаў, татальная вакцынацыя ў нашай краіне не патрэбна. Яна праводзіцца толькі ў эндэмічных рэгіёнах у паўднёвых абласцях.

Карысна ведаць

ЯКІЯ БЯСКРЫЎДНЫЯ СІМПТОМЫ ЎКАЗВАЮЦЬ НА РАННЮЮ ХВАРОБУ?

Даследаванні адзначаюць, што больш за палову дарослых людзей сутыкаліся з сігналамі, якія рана паказвалі на анкалагічны працэс. Але толькі 2 % з іх знаходзілі такую сувязь і своечасова звярталіся да ўрача. Спецыялісты ж сцвярджаюць, што нават калі такія сімптомы здаюцца бяскрыўднымі, пра іх усё ж варта паведаміць урачу і правесці адпаведнае абследаванне. Бо захворванне, выяўленае на пачатковай стадыі, мае высокія шанцы на поўнае лячэнне.

ЖАХЛІВЫ КАШАЛЬ

Пакашляванні, якія ўзнікаюць перыядычна, рэдка становяцца падставай для хвалявання. Аднак калі кашаль паўтараецца з зайздроснай рэгулярнасцю, становіцца няспынным і пакутлівым, з'яўляецца кроў, трэба адразу ж звяртацца да ўрача. Па-першае, такі сімптом разам з іншымі характэрнымі прыкметамі (пахудзеннем, слабасцю, пастаяннай субфебрыльнай тэмпературай) можа сігналізаваць аб раку лёгкіх. Па-другое, калі нават гэта акажацца не рак, такі кашаль на пустым месцы не ўзнікае — гэта можа быць бранхіт, пнеўманія ці іншыя не менш небяспечныя паталогіі, якія варта вылечыць як мага хутчэй.

ТУАЛЕТНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Складанасці з мочаспусканнем і змены стулу чалавек рэдка інтэрпрэтуе ў бок сур'ёзнай паталогіі. Звычайна спісваюць усё на няправільнае харчаванне і перахаладжэнне. Мінусам з'яўляецца і той факт, што праблемы гэтыя могуць быць перыядычна: спачатку баліць, затым — усё добра. З-за гэтага паход да ўрача зацягваецца. І дарэмна. Бо, напрыклад, збоі ў мочаспусканні, прысутнасць кропель крыві павінны наводзіць на думку, што маецца інфекцыя мочавыдзяляльных шляхоў. Калі ж далучаецца боль у паясніцы, варта як мага хутчэй наведаць уролага ці тэрапеўта. Цалкам магчыма, што праз такія сімптомы праяўляе сябе рак ныркі.

Калі ўзнікаюць праблемы з апаражненнем кішэчніка, таксама не варта грэбаваць візітам да спецыяліста. Усё, што датычыцца работы кішэчніка, злучана і з імунітэтам, бо ахоўныя сілы арганізма фармірюцца па большай частцы ў гэтым органе.

ПАСТАЯННЫ БОЛЬ

